

ХВОРЫЯ ВЕНЫ ПАГРАЖАЮЦЬ АРГАНІЗМУ **8**

АПРАНУЦЦА ДОРАГА Ў «СЭКАНДЗЕ» ЦІ НА РАСПРОДАЖЫ **9**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 КАСТРЫЧНІКА 2020 г. СЕРАДА № 210 (29324)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй БУГРОЎ, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў:**

*«Ёсць дзяржава і народ, а органы мясцовага кіравання і самакіравання — асноўнае злучальнае звяно паміж імі. Яны павінны шчыльна ўзаемадзейнічаць адно з адным, сувязь павінна стаць мацнейшай. У людзей ёсць прапановы па ўдасканаленні ўмоў у месцах, дзе яны жывуць. Просьбы грамадскасці па пытаннях паляпшэння добраўпарадкавання горада, вуліцы ці нават двара павінны быць пачутыя ўладай і разглядацца».*

## КОРАТКА

• **Кіраўнікі МЗС Беларусі і Расіі абмеркавалі пытанні інтэграцыйнага ўзаемадзеяння.**

• Музей гісторыі беларускай літаратуры падрыхтаваў праект да юбілеяў знакамітых драматургаў — Андрэя Макаёнка, Алеся Петрашкевіча і Аляксея Дударава.

• **Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху пройдзе ў Мінску 30 кастрычніка.**



• Міжнародны фестываль-конкурс «Творчасць без меж» пройдзе на восеньскіх канікулах у Мінску.

• **XXVIII Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш адбудзецца 10–14 лютага.**

• Беларускім студэнтам могуць даць гранты для праходжання стажыровак у Расіі.

• **Супрацоўнікі наркакантролю спынілі буйны канал пастаўкі наркотыкаў з Расіі ў Беларусь.**

• У Егіпце акула напала на ўкраінскую сям'ю, дзіця ў рэанімацыі.

ISSN 1990 - 763X

# Працуе скульптар — чуваць далёка



Захапляцца разьбой і рабіць драўляныя скульптуры можна з дапамогай розных рыштункаў, напрыклад звычайнага нажа, вялікіх і малых стамесак, нарэшце цяслярскай сякеры. А вось **работнік Мазырскага доследнага лясгаса Аляксандр ЗЯНЬКО** выразае фігуры жывёл, птушак і нават людзей толькі бензапілой. І больш нічым не карыстаецца. У гэтым яго асабістая творча-мастакоўская асаблівасць. Нават калі вобраз вымагае процьму дробных дэталяў і характэрных рыс, бензапіла ў руках Аляксандра, быццам бы паслухмяны пэндзаль, вымалёўвае і агульную пластыку, і індывідуальныя эмоцыі асобы. Нядаўна Аляксандр Зянько на тэрыторыі Крыніцкага лясніцтва закончыў чарговую групавую кампазіцыю драўляных фігур — насельнікаў беларускага лесу. Перад уваходнай брамай, сапраўды — як на выстаўцы: вялікія, з камлёў дуба выразаныя ўсё той жа пілой сустракаюць фантазійныя вобразы дзіка, ільва і лася. Якраз каля апошняга і зроблена гэтае фота. Аляксандр Зянько (ён у цэнтры) паказвае свае новыя творы работнікам лясніцтва — майстру лесу Віктару Камеку і вальшчыку Мікалаю Жыгадлу.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Спажывец

## ЗАПАС БЯДЫ НЕ ЧЫНІЦЬ

### Бульба і яблыкі добра захоўваюцца ў нас да канца мая

**Амаль кожны гарадскі жыхар у чарговыя выхадныя ў гэтыя кастрычніцкія дні наведвае сельскагаспадарчыя кірмашы, дзе закупляе бульбу, моркву, яблыкі для сямейнага харчавання. А потым на працягу доўгай зімы мы радуем сябе водарам і смакам айчынных садавіны і агародніны. Вялікі горад таксама робіць сабе запасы, яны называюцца стабілізацыйныя фонды на міжсезонны перыяд. У нашай сталіцы сёлета такія фонды было вырашана арганізаваць на базе гандлёва-закупачнага, аптова-рознічнага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Партызанскае». Акрамя таго, мы даведаліся, як рыхтуюцца да новага «зялёнага» сезона на Мінскай агароднінай фабрыцы.**

СТАР.4



Спецыяльны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## Віталь і яго Габрыэла

### Карэспандэнты «Звязды» даведаліся, як працуюць ратавальнікі-кінолагі



**У Беларусі прайшлі спартыўныя спаборніцтвы па службовым шматбор'і кінолагаў. Удзел у іх бяруць прадстаўнікі розных ведамстваў, якія так ці інакш задзейнічаюць чатырохногіх памочнікаў. Адзін з этапаў спаборніцтваў прайшоў на базе Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі — менавіта пры ім дзейнічае адмысловая кіналагічная служба. Задача на сабак тут ускладаецца вельмі адказная: знайсці пад заваламі жывых людзей. А як гэта адбываецца, на свае вочы пабачылі карэспандэнты «Звязды».**

СТАР. 5

З першых вуснаў

# «Гэта павінен быць рэальны дыялог па выпрацоўцы стратэгіі развіцця краіны»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па падрыхтоўцы шостага Усебеларускага народнага сходу. На разгляд кіраўніка дзяржавы ўнесены адпаведны нарматыўны прававы акт. Непасрэдна дакладвалі яму аб тым, як ідуць справы, старшыні палат парламента Уладзімір Андрэйчанка і Наталля Качанава, прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Валерый Вакульчык, кіраўнік спраў Прэзідэнта Віктар Шэйман, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, мэр сталіцы Уладзімір Кухараў і прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант.**

## ЯК ВЫРАШЫЦЬ БЕЛАРУСКІ НАРОД

Перш чым падпісаць прававы акт аб падрыхтоўцы сходу і стварэнні аргкамітэта, Прэзідэнт адзначыў, што хацеў бы абмеркаваць з запрошанымі некаторыя аспекты мерапрыемства, што мае адбыцца. «Як я ўжо казаў, Усебеларускі сход — асаблівая форма народаўладдзя ў нашай краіне. І думаю, што гэту форму грамадскай творчасці трэба зрабіць канстытуцыйнай», — сказаў кіраўнік дзяржавы, заўважыўшы, што рабіць гэта трэба «не пад нейкіх асоб».

Ён дадаў, што прапановы прапісаць Усебеларускі сход у Канстытуцыю паступалі і ад грамадскасці, і ён іх падтрымлівае.

Таксама на форуме народ павінен вызначыць, як будзе жыць у бягучай пяцігодцы.

«Кітайцы да гэтага часу так працуюць. У іх Усекітайскі сход народных прадстаўнікоў. Яны збіраюцца, вырашаюць асноўныя пытанні і нармальна жывуць. Імперыяй сталі. Таму пяцігодка наперадзе. Трэба вызначыцца, як мы будзем жыць. Жыццё ідзе, краіна працуе і развіваецца», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён зноў нагадаў, што сёлета сабралі добры ўраджай. Толькі па збожжы — амаль 10,5 мільёна тон, і на такім узроўні неабходна трымацца.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што нягледзячы на ўльтыматумы, у спакойным рытме працуюць прадпрыемствы, транспарт, гандаль, але даецца гэта няпроста. ***«Людзі працуюць, жывуць і патрабуюць бяспечнага жыцця,*** — падкрэсліў Прэзідэнт. — ***Мы абавязаныя гэта патрабаванне народа забяспечыць. Забяспечыць усімі магчымымі, даступнымі па законе сродкамі».***

Прэзідэнт нагадаў прысутным, што пры прыняцці лёсавызначальных для краіны рашэнняў заўсёды раіліся з людзьмі.

***«Казаў неаднаразова і яшчэ раз паўтару: усё будзе так — і Канстытуцыя, і рашэнні будуць прымацца, як вырашыць толькі беларускі народ.*** Гэта не пустыя словы, гэта мая клятва. ***Напрыканцы майго прэзідэнцкага жыцця я гарантую, што будзе толькі так, як вырашыць народ.*** Мы не будзем мышкаваннем займацца і стварэць нешта пад сябе», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт перакананы: мэта дыялогавых пляцовак, што праходзяць па ўсёй краіне, — пачуць меркаванні ўсіх колаў насельніцтва. «Такім чынам мы прыцягваем да абмеркавання актуальных пытанняў большую частку нашага грамадства. І дзякуй богу, я баюся тут ацэнкі нейкія даваць, але па ўсёй краіне яны ідуць і людзі разважаюць. А каму трэба вайна, не рэвалюцыя, яны на вуліцах у Кухарава (мэр сталіцы. — **«Зв.»**) у Мінску», — канстатаваў ён.

Усе прапановы павінны быць абагульненыя і накіраваныя ў арганізацыйны камітэт Усебеларускага народнага сходу.

На сходзе таксама будуць падведзены вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за апошнія 5 гадоў. «Важна знайсці і выявіць прычыны, чаму не ўсё, што мы планавалі, дасягнулі. Таму ***ключавой задачай, якую нам варта паставіць перад удзельнікамі сходу, з'яўляецца выпрацоўка сучасных, эфектыўных і рэальна дзейсных механізмаў, што дапамогуць нам вырашыць праблемы, якія стрымліваюць эканамічны рост»,*** — дадаў Прэзідэнт.

Па яго словах, кіраўнікам мясцовых органаў улады трэба вельмі ўважліва падысці да абрання дэлегатаў сходу.

«Тут павінны быць прадстаўнікі ўсіх слаёў грамадства, якія хочуць нешта сказаць, якія хочуць быць пачутыя і ўмеюць слухаць, усіх сацыяльных і прафесійных груп, грамадскіх арганізацый, дэпутаты ўсіх узроўняў. Не толькі кіраўнікі, але і людзі ад станка, ад зямлі, якія непасрэдна ведаюць і адчуваюць усе праблемы чалавека», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што не страшна, калі будуць розныя меркаванні — у выпадку, калі на сходзе яны не прагучаць, можна лічыць яго праваленым. ***«Гэта павінен быць рэальны дыялог па выпрацоўцы стратэгіі развіцця краіны. Няхай людзі гавораць, адкрыта абмяркоўваюць — прымем рашэнні і будзем па іх жыць»,*** — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Як расказаў журналістам **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА,** шосты Усебеларускі сход адбудзецца ў пачатку будучага года — у студзені ці лютым. А ўжо ў найбліжэйшыя дні сфарміруюць яго арганізацыйны камітэт. Форум будзе значна адрозніваецца ад мінулых тым, што абмяркуюць на ім не толькі пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця, але і грамадска-палітычнага жыцця.

«Сход павінен быць яркі і насычаны. Насычаны, то-бок там павінны быць розныя погляды. Калі будзе дыялог, будуць розныя погляды і дэлегаты ад працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый і калі яны будуць адстойваць свае погляды, гэта будзе на карысць краіне», — паведаміў Раман Галоўчанка.

## «МЫ ПАЧЫНАЕМ СУТЫКАЦЦА З ТЭРАРЫСТЫЧНЫМІ ПАГРОЗАМІ»

Нарада пачалася пазней, чым планавалася. Прэзідэнт адзначыў, што графік прыйшлося памяняць з-за абмеркавання рэагавання органаў улады на сітуацыю ў краіне.

«Пратэстуны» гэтыя блукаюць на вуліцах. У асноўным у Мінску. Але тым не менш мы канстатавалі факт, што маса тых, хто застаўся, радыкалізавалася. Мы дакладна бачым арганізатараў і тых, хто ўвасабляе гэтыя ідэі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, ён раней даваў загад — працаваць акуратна, пакуль пратэстоўцы не перайшлі чырвоную рысу. Але апошнія некалькі дзён, дадаў Прэзідэнт, сведчаць, што па многіх кірунках лінія пяройдзена. «Як можна ацэньваць, што яны выйшлі на чыгунку і пачынаюць блакіраваць аўтаматыку, як спецыялісты кажуць, замыканне рэек ажыццяўляць. Гэта можа прывесці да сур'ёзных аварый на чыгунцы, катастроф і гібелі мноства людзей. ***Гэта дзеянні арганізаваных злачынных груп з прыкметамі тэрарызму. Мы пачынаем сутыкацца з тэрарыстычнымі пагрозамі»,*** — заявіў Прэзідэнт.

Ён расказаў: у сувязі з заклікамі з Польшчы і Літвы пра ўльтыматумы і забастоўкі папярэджваў прэм'ер-міністра аб тым, што не трэба нікога ўгаворваць працаваць і вучыцца.

***«Сёння такі момант, калі кожны ў сваім жыцці павінен выбіраць дарогу, па якой будзе рухацца.*** Не толькі ён, але і яго дзеці. Не хочуць рабочыя працаваць, не трэба. Але адзінкі не хочуць. Вызваліце астатнюю частку, якія хочуць працаваць, ад гэтай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Такі падыход і да студэнтаў. «Хто хоча вучыцца, хай вучыцца. Хто выйшаў у парушэнне закона на несакцыянаваныя акцыі, пазбаўляецца права быць студэнтам. Калі ласка, адпраўце іх, як я казаў, каго ў армію, каго на вуліцы. Хай ходзяць па вуліцах. Але яны павінны быць адлічаны з ВНУ. Тое самае і выкладчыкі, якіх адзінкі, што брыдка сябе паводзяць у ВНУ», — выказаўся кіраўнік краіны.

Па словах Прэзідэнта, сёння адбываецца радыкалізацыя пратэстаў і разгарнулі ўжо не інфармацыйную, а тэрарыстычную вайну. На яго думку «нецярпіма», калі прыцемкам пратэсты з цэнтральных вуліц перабіраюцца ў спальныя раёны сталіцы: «Хадзілі-хадзілі па Мінску. Мэта была захапіць цэнтр. У цэнтр не пусцілі. Прыцемкі, пайшлі на аддзелы міліцыі. Пайшлі, што самае страшнае, у спальныя раёны. Цёмна. Людзі напалоханыя», — працягнуў Прэзідэнт.

Звярнуўся ён да бацькоў студэнтаў і школьнікаў: «Прыбярыце сваіх дзяцей з вуліцы, каб потым не было балюча. А з астатнімі мы будзем разбірацца па ўсёй строгасці закона».

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ У ТЭМУ

Па словах прэм'ер-міністра Беларусі Рамана Галоўчанкі, абстаноўка на прадпрыемствах спакойная і працоўная.

«Не паявлічваючы пагрозу, хачу звярнуцца ў тым ліку да тых, хто заклікаў беларускія прадпрыемствы да стачак і забастовак. Гэта прамыя заклікі да шкоды сваёй краіне і людзям, што жывуць у ёй. Заклік спыніць прадпрыемствы не што іншае, як расчыстка месца для канкурэнтаў. Беларусь — эканоміка адкрытая. Мы знаходзімся ўвесь час у канкурэнтнай барацьбе, ці гэта нафтапрадукты, ці калійныя ўгнаенні, машынабудаванне, прадукты харчавання. Любое спыненне вытворчасці на руку нашым канкурэнтам», — канстатаваў Раман Галоўчанка.

Спыняючы вытворчасць нафтапрадуктаў, страчваем грошы ад здзелак, а гэта — выплаты працоўным. Але самае небяспечнае — магчымасць потым не вярнуцца на рынак.

Такія наступствы ўжо выпрабаваў на сабе «Беларуськалій», калі спыненне некалькіх рудаўпраўленняў на ноч выклікала «радасць» канкурэнтаў. Асабліва кіраўнік урада адзначыў нагнятанне абстаноўкі на небяспечных вытворчасцях.

«Любое ўмяшанне ў тэхналагічны працэс — пагроза тэхнагеннай катастрофы. Ці гэта «Гродна Азот», «Магілёўхімвалакно», у нас дастаткова такіх вытворчасцяў. Да чаго вы заклікаеце?» — абурыўся ён.

Пашкоджанне аўтаматыкі на чыгунцы Раман Галоўчанка параўнаў з «рэйкавай вайной» і падкрэсліў, што цаной такіх дзеянняў могуць быць жыцці людзей.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Улады ЗША рыхтуюцца да беспарадкаў пасля выбараў



Міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША актыўна рыхтуецца да магчымых беспарадкаў, якія могуць ахапіць краіну да або пасля ўсеагульных выбараў, што павінны прайсці 3 лістапада. Аб гэтым заявіў выконваючы абавязкі намесніка кіраўніка МУБ Кен Кучынэлі, паведаміў тэлеканал CNN. «Нашы каманды гатовыя дзейнічаць так, як трэба», — заявіў ён. Пры гэтым, па словах амерыканскага сілавіка, у МУБ няма канкрэтных разведданых пра пагрозу ўспышак гвалту ў краіне, аднак гэтая сітуацыя можа хутка змяніцца. Узмоцнена рыхтуюцца да падаўлення беспарадкаў у першую чаргу два дэпартаменты: Служба мытнага і пагранічнага кантролю і Служба іміграцыйнага і мытнага кантролю. Атрады спецыяльнага прызначэння гэтых ведамстваў прыцягваліся летам да падаўлення пратэстаў у Портлендзе (штат Арэгон) і сталіцы ЗША — Вашынгтоне. Мэр Нью-Ёрка Біл дэ Блаз раней заявіў на прэс-канферэнцыі, што не выключае магчымых грамадскіх беспарадкаў у мегаполісе. Адзін з нью-ёркскіх паліцэйскіх начальнікаў Тэры Монахан заявіў, што з 26 кастрычніка паліцыя горада мабілізуе дадаткова сотні супрацоўнікаў — для прадухілення інцыдэнтаў напярэдадні выбараў.

## Большасці еўрапейскіх кампаній пагражае банкруцтва

Больш за палову еўрапейскіх кампаній малога і сярэдняга бізнесу сцвярджае, што ў наступным годзе ім пагражае банкруцтва з-за пандэміі каранавіруса, калі іх даходы не пачнуць расці. Пра гэта паведаміў Bloomberg. Кожная пятая кампанія Італіі і Францыі падрыхтавалася да падачы заявы аб банкруцтве на працягу шасці месяцаў. Прадпрыемствы з'яўляюцца ключавымі для рэгіёна, на іх прыпадае больш за дзве трэці рабочай сілы. Пандэмія моцна ўдарыла па еўрапейскіх фірмах, 70 працэнтаў паведаміла аб зніжэнні даходаў. Большасць еўрапейскіх прадпрымальнікаў лічаць эканамічную сітуацыю трывожнай, яны турбуюцца з нагоды немагчымасці плаціць па крэдытах і неабходнасці звальненняў супрацоўнікаў. Так, у Германіі з'яўляецца ўсё больш так званых зомбі-кампаній, якія ў канчатковым выніку могуць падарваць эканоміку на доўгія гады наперад. Тысячы такіх прадпрыемстваў не могуць пакрыць свае выдаткі па абслугоўванні доўгу за кошт прыбытку. Многія эканамісты ўпэўненыя, што падобным фірмам лепш даць закрыцца, чым штучна падтрымліваць іх існаванне.



## Бельгійскі шакаладзье прызнаны найлепшым у свеце кандытарам



Прыз «Найлепшы кандытар свету» быў прысуджаны бельгійскаму шакаладзье П'еру Маркаліні, паведамілі СМІ Бельгіі. Гэта адбылося на знакамітым зорным аглядзе World Pastry Stars 2020, які быў арганізаваны сёлета з-за пандэміі каранавіруса ў віртуальнай форме. Журы, якое складаецца з незалежных журналістаў, аднагалосна выбрала бельгійца. П'ер Маркаліні ўжо быў абвешчаны чэмпіёнам свету ў галіне кандытарскіх вырабаў у 1995-м у Ліёне. У тым жа годзе ён заснаваў у Бруселі кампанію La Maison Pierre Marcolini. Сёння яна налічвае больш за 40 буцікоў, акрамя Бельгіі, у прыватнасці ў Францыі, Вялікабрытаніі, Японіі і Кітаі.

Прафарыенцір

# АД ХОБІ — ДА ПРАФЕСІІ

## Як звычайны турысцкі паход можа стаць выдатнай школай жыцця

**Для сістэмы дадатковай адукацыі ўласцівы адкладзены ў часе эфект. Дадатковая адукацыя не проста дапамагае знайсці сябе — яна мае магутны выхаваўчы патэнцыял, папулярызуе сярод дзяцей і падлеткаў сучасныя прафесіі, развівае іх творчыя і інтэлектуальныя здольнасці. Заняткі ў аб'яднаннях па інтарэсах дазваляюць выхаванцам адчуць сябе паспяховымі, што павышае іх самаацэнку, набыць уласны ўнікальны досвед, паспрабаваць рэалізавацца ў розных сферах дзейнасці.**


Weitjby.

Вывучаць касмічную біялогію, мікрафлюідыку і графічны экадызайн, займацца 3D-мадэляваннем, нейрапілатаваннем, дызайнам адзення і аксесуараў, вырабляць кераміку, ствараць мультфільмы і відэагульні, займацца гістарычнай рэканструкцыяй і дэкаратыўнай апрацоўкай металу — вось далёка не поўны пералік заняткаў, якія сёння прапануюць дзецям і моладзі ўстановы дадатковай адукацыі. Усяго ў нацыянальнай сістэме адукацыі функцыянуе 278 такіх устаноў: іх наведвае больш за 386 тысяч выхаванцаў.

— Усе навыкі, якія дзеці атрымліваюць у сістэме дадатковай адукацыі, у той ці іншай ступені будуць запатрабаваныя на працягу іх жыцця, — лічыць **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці Ала ГЕРАСІМУК.** — Гэта дазволіць нашым выхаванцам прасцей адаптавацца да новых запытаў рынку працы і быць больш паспяховымі ў прафесійным асяроддзі.

У час глабальнага развіцця інтэрнэту і камп'ютарных тэхналогій заваяваць, а тым больш утрымаць увагу дзяцей і падлеткаў вельмі праблематычна. Таму многія ўстановы дадатковай адукацыі спрабуюць пераасэнсаваць сваё месца і ролю ў новай сістэме каардынат: мадэрнізуючы традыцыйныя кірункі, паралельна развіваюць і тое, што сёння знаходзіцца на хвалі цікавасці ў падрастаючага пакалення. Напрыклад, у Рэспубліканскім цэнтры інавацыйнай і тэхнічнай творчасці школьнікам прапануюць вывучаць прататыпаванне і нейратэхналогіі, займацца інжынерным дызайнам CAD і робататэхнікай, канструяваць радыёэлектронныя прылады і кіраваць беспілотнымі лятальнымі апаратамі.

Адна з асноўных задач установы — гэта пабудова зместу дадатковай адукацыі тэхнічнага профілю ў адпаведнасці з сацыяльным заказам. Інавацыйнасць закладзена нават у назве цэнтра. Як толькі там заўважаюць новыя тэндэнцыі, адразу ўносяць змяненні ў змест адукацыі, а затым у ходзе эксперыментальнай дзейнасці распрацоўваюць праграмнае і метадычнае забеспячэнне новага кірунку. Аб'яднанні па інтарэсах становяцца эксперыментальнымі лабараторыямі, у якіх апрабоўваюцца новыя вучэбныя праграмы. І ўжо выпрабаваны прадукт транслюецца затым на ўсю краіну.

— Сучасны рынак працы патрабуе развіцця інжынернага і прадпрымальніцкага мыслення і ўнікальных кампетэнцый. Мы не можам гэтага не заўважаць. І калі вызначаем новыя кірункі, то арыентуемся на міжнародны досвед, у прыватнасці на міжнародны рух JuniorSkill, — тлумачыць Ала Герасімук. — JuniorSkill — гэта праграма ранняй прафарыентацыі і прафесійнай падрыхтоўкі школьнікаў, скіраваная на прыцягненне ўвагі да сучасных высокатэхналагічных прафесій. У яе межах праводзяцца розныя спаборніцтвы. У Беларусі ўжо прайшлі тры нацыянальныя чэмпіянаты JuniorSkill Belarus. І наша каманда даволі паспяхова выступіла на міжнародным чэмпіянаце ў Казані, дзе заваявала чатыры сярэбраныя і адну бронзавую ўзнагароды.

Увогуле, аказанне дапамогі моладзі ў прафесійным самавызначэнні ў Рэспубліканскім цэнтры інавацыйнай і тэхнічнай творчасці лічаць адным з вельмі важных кірункаў сваёй дзейнасці.

Акрамя такіх традыцыйных формаў работы, як прафарыентацыйнае інфармаванне, прафесійнае кансультаванне па пытаннях выбару прафесій (групавых і індывідуальных кансультацый), тут праводзяць і прафарыентацыйныя квэсты.

— Квэст «Майстар Град» — гэта займальная гульня з сюжэтам, — расказвае **загадчык аддзела прафілізацыі і прафесійнай арыентацыі моладзі Іна КАРПЕНКА.** — Яна дазваляе навучэнцам пазнаёміцца з сучаснымі кампетэнцыямі і прайсці прафесійныя пробы па такіх кірунках, як робататэхніка, 3D-друк, электроніка, Web-тэхналогіі і графічны дызайн, інжынерны дызайн CAD, беспілотныя лятальныя апараты. У працэсе гульні за абмежаваны час школьнікі выконваюць пэўныя заданні, што таксама вучыць іх самаарганізацыі ва ўмовах тайм-менеджменту. За праходжанне кожнай станцыі ўдзельнікі атрымліваюць частку пазла, які па заканчэнні гульні павінен скласціся ў адзінае цэлае.

Прафарыентацыйны квэст «Майстар Град» — гэта сучасная тэхналогія суправаджэння прафесійнага выбару, якая эфектыўна прасоўвае запатрабаванасць і перспектыўныя прафесіі без выкарыстання прымітыўных лабавых рашэнняў і сацыяльнай рэкламы. Яшчэ адна з мэт прафарыентацыйнага квэста — развіццё навыкаў SoftSkills, так званых мяккіх, надпрафесійных навыкаў, якія не звязаны з канкрэтнай прадметнай галіной, але неабходныя для паспяховай кар'еры.

Дарэчы, спецыялісты лічаць удзел бацькоў у прафесійным кансультаванні іх дзяцей вельмі важным, каб тыя разумелі абгрунтаванасць выбару той ці іншай прафесіі, бачылі логіку таго, што адбываецца, і змаглі дапамагчы сыну або дачцэ ў рэалізацыі іх планаў у будучыні.

Педагогі дадатковай адукацыі сцвярджаюць, што заняткі ў гуртках і аб'яднаннях па інтарэсах — больш, чым проста хобі, для многіх яны вызначылі прафесійны выбар на ўсё жыццё. І нават калі малады людзі ў выніку выбіраюць іншы кірунак сваёй прафесійнай самарэалізацыі, яны ўсё роўна больш прыстасаваныя да жыцця, і тыя здольнасці, якія яны развівалі ў аб'яднаннях па інтарэсах, абавязкова дапамагаюць ім у іншых сферах.

— Той жа турызм — гэта яшчэ і цудоўная школа выжывання, уменне жыць у калектыве, працаваць у камандзе, прымаць правільныя рашэнні ва ўмовах, якія хутка змяняюцца, і несці за іх адказнасць, — падкрэслівае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Лідзія ЖУР.**

Выхаванцы аб'яднанняў турысцкага кірунку могуць самастойна паклапаціцца пра сябе і заўсёды знойдуць выхад з любой складанай сітуацыі. Сёння віртуальная камунікацыя замяніла жывыя зносіны, але яна не можа кампенсаваць такі момант, як развіццё лідарства. Толькі ўявіце сабе, якую глебу для фарміравання лідараў дае звычайны турысцкі паход. А колькі жыццёвага досведу!

Ніякія гутаркі, лекцыі, падручнікі не працуюць на патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі так, як падарожжы і краязнаўчыя экспедыцыі. Геолаг, археолаг, геадэзіст — дзе яшчэ можна бліжэй пазнаёміцца з такімі даволі рэдкімі прафесіямі, як не ў аб'яднаннях экалагічнага і турыстычнага кірункаў? Дзеці, якія пісалі праекты па азеляненні прышкольных тэрыторый, ідуць у дызайнеры, тут вырастаюць будучыя біёлагі, экологі, генетыкі ды не толькі.

Па словах Лідзіі Жур, сістэма дадатковай адукацыі выгадна адрозніваецца большай свабодай. «Педагог, які зацікаўлены ў тым ці іншым кірунку дзейнасці, можа на падставе тыпавых адукацыйных праграм Міністэрства адукацыі стварыць сваю праграму аб'яднання па інтарэсах, якая будзе адпавядаць інтарэсам і запытам выхаванцаў і іх бацькоў, канешне, калі для гэтага ёсць адпаведная матэрыяльная база. А ў нас у цэнтры створана вельмі добрая база».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На слыху

# ПЕРАПРАФІЛЯВАЛІСЯ СВОЕЧАСОВА

## Дзе лечаць пацыентаў з COVID-19

**Сёння ў краіне перапрафілявана дастаткова бальніц для таго, каб забяспечыць медыцынскай дапамогай пацыентаў з COVID-19, паведамляе Міністэрства аховы здароўя.**

За апошнія некалькі месяцаў значна палепшылася сітуацыя з забеспячэннем кіслароднымі пунктамі — у наяўнасці 2 тыс. 184 апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх, больш за 1 тыс. 500 наркозна-дыхальных апаратаў, 9 тыс. 688 пунктаў падключэння кіслароду, 3 тыс. 75 дазатараў кіслародна-паветранай сумесі, 433 кіслародныя канцэнтратары. Установы забяспечаны лекамі для аказання медыцынскай дапамогі і сродкамі індывідуальнай аховы. Іх запас дазваляе забяспечыць работу арганізацый аховы здароўя на працягу больш чым двух месяцаў.

Падчас цяперашняга эпідэмічнага ўздыму прынята рашэнне не закрываць усе бальніцы і ўсе аддзяленні, а частку з іх пакінуць для аказання звычайнай планавай, высокатэхналагічнай і спецыялізаванай дапамогі.

Сёння ў Мінску працуюць 88 арганізацый аховы здароўя, з іх 26 бальнічных. Агульная колькасць ложкаў у стацыянарах сталіцы складае 10 тыс. 115, для дзяцей — 2 тыс. 15. З 23 кастрычніка перапрафілявана для лячэння пацыентаў з пнеўманіяй і COVID-19 2-я гарадская клінічная бальніца. У перыяд уздыму захваральнасці COVID-19 пацыентаў прымаюць інфекцыйная клінічная бальніца Мінска і дзіцячая інфекцыйная клінічная бальніца.

Акрамя таго, пацыентаў з COVID-19 шпіталізуюць у 3-ю гарадскую бальніцу імя Клумава (тэрапеўтычны корпус), 4-ю бальніцу (тэрапеўтычны корпус, частка хірургічнага корпуса і нефралагічнае аддзяленне), 5-ю бальніцу (неўралагічны корпус і корпус № 1) і 6-ю гарадскую бальніцу (тэрапеўтычны корпус), у РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі і Рэспубліканскі клінічны шпіталь інвалідаў ВАВ імя П. М. Машэрава.

**У Гомельскай вобласці** перапрафілявана 2 тыс. 560 ложкаў. Пацыентаў з COVID-19 шпіталізуюць у Гомельскую абласную інфекцыйную бальніцу, абласны туберкулёзны шпіталь, гомельскія гарадскія клінічныя бальніцы — № 1, № 2, № 4, бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі, а таксама ў абласны клінічны шпіталь ІАВ, а таксама цэнтральныя раённыя бальніцы.

**У Віцебскай вобласці** перапрафілявана ў інфекцыйныя 1 тыс. 487 ложкаў. У Віцебску пацыентаў з COVID-19 прымаюць Віцебская абласная інфекцыйная бальніца, гарадская бальніца хуткай медыцынскай дапамогі, гарадская цэнтральная бальніца, абласны скурвендыспансер, таксама задзейнічаны нефралагічны корпус Віцебскай абласной клінічнай бальніцы. **У Полацку** пацыентаў з COVID-19 прымае гарадская бальніца, **у Наваполацку** — цэнтральная гарадская бальніца (інфекцыйнае аддзяленне) і скурна-венералагічны дыспансер. **У Оршы** — гарадская бальніца № 3 і пульманалагічнае аддзяленне бальніцы імя Сямашкі.

**У Магілёўскай вобласці** на 22 кастрычніка перапрафіляваны для аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з «ковідам» і пнеўманіяй 1 тыс. 751 ложак. Пацыентаў з COVID-19 шпіталізуюць у Магілёўскі абласны супрацьтуберкулёзны дыспансер, інфекцыйную бальніцу, гарадскую бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі, Магілёўскую бальніцу № 1, Бабруйскую цэнтральную бальніцу, Магілёўскі абласны скурна-венералагічны дыспансер, Магілёўскую абласную дзіцячую бальніцу.

**У Гродзенскай вобласці** перапрафіляваны на работу з каранавіруснымі хворымі 2 тыс. 200 ложкаў. У Гродне гэта абласная інфекцыйная бальніца, гарадскія бальніцы № 2 і № 3, Гродзенская абласная бальніца медрэабілітацыі, Гродзенскі абласны клінічны цэнтр фтызіятрыі і Гродзенская універсітэцкая клініка.

У стацыянарах **Мінскай вобласці** для хворых на COVID-19 дзейнічае 1 тыс. 762 ложкі. Жыхары вобласці шпіталізуюцца ў Мінскі абласны супрацьтуберкулёзны дыспансер, Барысаўскую бальніцу № 2, Жодзінскую гарадскую цэнтральную бальніцу. А таксама ў цэнтральныя раённыя бальніцы Маладзечна, Мар'інай Горкі, Слуцка, Стоўбцаў, Салігорска.

**У Брэсцкай вобласці** перапрафіляваны для работы з COVID-19 1 тыс. 867 ложкаў. Жыхары Брэста з цяжкім цячэннем COVID-19 шпіталізуюцца ў Брэсцкую цэнтральную гарадскую бальніцу і інфекцыйнае аддзяленне Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы. Жыхары вобласці шпіталізуюцца ў Баранавіцкую гарадскую бальніцу, у Баранавіцкую гарадскую бальніцу № 2. Таксама для пацыентаў з COVID-19 перапрафіляваны частка ложкаў Пінскай цэнтральнай гарадской бальніцы, а таксама цэнтральныя раённыя бальніцы Івацэвіч, Кобрына, Лунінца, Століна і Бярозы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# РАСЦЕ ЗАХВАРАЛЬНАСЦЬ НА ПНЕЎМАНІЮ

**У Брэсце назіраецца рост захваральнасці на каранавірусную інфекцыю і пнеўманію. Пра гэта ў сваім тэлеграм-канале паведаміў падпісчыкам старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**

— Па цяжкасці цячэння хваробы гэта хваля нашмат горшая, — канстатуе мэр. — У бальніцу трапляе больш пацыентаў пажылога ўзросту з цяжкімі спадарожнымі захворваннямі. Толькі за мінулыя суткі былі шпіталізаваны 92 пацыенты з дыягназам «пнеўманія».

У Брэсцкай цэнтральнай гарадской бальніцы пад інфекцыйныя шпіталі перапрафіляваны 12 аддзяленняў з 14 — напрыклад, два тыдні таму было шэсць такіх аддзяленняў.

У сваім паведамленні кіраўнік горада настойліва рэкамендуе абмежаваць наведванне месцаў масавага збору людзей, не выязджаць за межы рэгіёна. Пры наведванні магазінаў, аптэк, іншых месцаў агульнага карыстання ў грамадскім транспарце абавязкова трэба выкарыстоўваць маскі і антысептыкі, захоўваць дыстанцыю. Важна абмежаваць кантакты і звесці да мінімуму адхіленне ад жыццёва неабходных маршрутаў.

# ЗАПАС БЯДЫ НЕ ЧЫНІЦЬ

## СЁЛЕТА ЗНАЧНА МЕНШ, АЛЕ ТОЛЬКІ САМАЕ ЛЕПШАЕ

Пастановай Савета Міністраў такія фонды фарміруюцца штогод. Усё зроблена для таго, каб не пакінуць людзей зімой без ежы і вітамінаў.

Як адзначыла **начальнік аддзела сельскай гаспадаркі і харчавання Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Ала СЯРГЕЕВА,** на міжсезонны перыяд 2020—2021 гадоў у сталіцы вызначаны такія аб'ёмы закладкі: 1 500 тон бульбы, 800 тон капусты, па 500 тон морквы, цыбулі і яблыкаў, а таксама 250 тон буракоў. Захоўвацца агародніна і садавіна будуць на пляцоўцы УП «Партызанскае» ў прамысловай зоне Калядзічы.

Шмат гэта ці дастаткова? Пытанне не самае простае. Летась, напрыклад, зрабілі запас бульбы на 10 тысяч тон, яблыкаў і морквы — на 5 тысяч тон. Сёлета, як бачым, будзе назапашана ў разы менш, а па некаторых пазіцыях — у дзясяткі разоў менш. Як гэта разумець?

«Так, сапраўды, у мінулыя гады аб'ёмы закладкі былі значна большыя, — адзначае прадстаўнік гарвыканкама. — Але сельская гаспадарка развіваецца. Цяпер, што радуе, — і дзяржпрадпрыемствы, і фермерскія гаспадаркі здольныя самі якасна захоўваць прадукцыю. Намецілася тэндэнцыя пастаўак сельгаставараў у гандлёвыя арганізацыі наўпрост ад вытворцаў, таму няма патрэбы закладваць велізарныя аб'ёмы». Нярэдка так атрымлівалася, калі на працягу ўсёй зімы прадукцыя стабілізацыйных фондаў была незапатрабаванай. Крыўдна потым, прадукты досыць добрай якасці адпраўляць на перапрацоўку.

Таму аб'ёмы закладкі цяпер арыентаваныя на ўзровень сярэднямесячнай рэалізацыі ў гандлі. Такім чынам, у Мінску зроблены так званы стратэгічны запас неабходных прадуктаў. Ён патрэбны для экстраннага выпадку, калі, дапусцім, асноўныя вытворцы цыбулі некарэктна падлічылі свае запасы, ці ў іх раптам яна сапсавалася. Стратэгічны запас робіцца для таго, каб цалкам выключыць няхватку асноўных прадуктаў харчавання.

Па словах **гендырэктара УП «Партызанскае» Тацяны КУЗАЎЛЁВАЙ,** у Мінск для фарміравання стабфондаў бульба пастаўляецца пераважна з гаспадарак Мінскай вобласці, цыбулі — з Магілёўскай вобласці, яблыкаў — ад сельгасвытворцаў Брэсцкай вобласці. Мінск, як самы вялікі і дарагі горад, дазваляе сабе выбіраць усё самае лепшае.

Сёння на прадпрыемстве нарыхтавана 800 тон бульбы, або 52 % да плана, 300 тон яблыкаў, або 58 %, 60 тон цыбулі (13 %) і 20 тон морквы.

## ПАПЯРЭДНЯЯ ПАДРЫХТОЎКА І АНАЛІЗ — АБАВЯЗКОВА

Для прадуктаў «жыццё» тут замірае на працягу 7–8 месяцаў. І ў гэтым выпадку звычайнага памяшкання недастаткова — захоўванне прадугледжвае пэўныя ўмовы, каб папярэдзіць хваробы і пашкоджанне.

Перад тым як трапіць у халоднае сховішча, агародніна і садавіна праходзяць сур'ёзную праверку ў фізіка-хімічнай цэнтральнай таваразнаўчай лабараторыі. Гэта вывучэнне дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку прадукцыі, а таксама своеасаблівы павярхоўны кантроль па арганалептычных паказчыках. Дадаткова — аналіз на ўтрыманне нітратаў, радыенуклідаў і іншых непатрэбных і нават шкодных хімічных злучэнняў.

«Бяром невялікую колькасць прадукцыі з партыі і спачатку правяраем вонкавы выгляд: ці ёсць прыкметы загнівання або захворвання, шкоднікі, пасля праводзім тэсты. На аснове атрыманых вынікаў вызначаем, ці можна захоўваць прадукцыю. Калі так, то колькі яна зможа праляжаць. Вырашаем, якую партыю неабходна рэалізаваць першай, а якая можа знаходзіцца ў сховішчы больш доўгі час», — расказвае аб праверцы **загадчыца лабараторыі УП «Партызанскае» Наталля БУЛЬГА.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Фота БелТА.

Пасля некалькіх стадый праверкі на якасць, партыя, якая прайшла адбор, ідзе на адгрузку, а затым змяшчаецца ў халадзільнае абсталяванне. Але і тут ёсць нюансы: калі яблыкі можна загружаць у камеры і ставіць фіксаваную тэмпературу адразу, то бульба павінна пераждаць лячэбны перыяд у некалькі дзён, каб зажылі механічныя пашкоджанні на клубні.

У залежнасці ад віду агародніны і садавіны вызначаюцца тэмпературныя нормы і вільготнасць у сховішчы. Напрыклад, капуста, морква і буракі патрабуюць ад 0 да 2 градусаў, яблыкі — ад 0 да плюс 4 градусаў, а бульба — 3—6 цяпла. За паказчыкамі на гігрометры тут сочаць двойчы на дзень, таму прадукты заўсёды знаходзяцца пад кантролем. Але сітуацыі бываюць розныя. Калі таваразнаўцы заўважаюць, што прадукцыя пачынае псавацца, такі тавар тэрмінова ліквідуюць.

**Таваразнаўца Людміла КРАЎЧАНКА** прыводзіць у прыклад умовы захоўвання яблыкаў:

— Яблыкі захоўваюцца пры аптымальнай тэмпературы ад 0 да 2 градусаў, а часам — да плюс 4, у залежнасці ад сорту. Вільготнасць паветра пры захоўванні — 90—95 %. Садавіна пры правільным захоўванні спакойна даляжыць да сакавіка, можа быць, нават да мая. Выкарыстоўваюцца толькі самыя лёжкія і буйныя сарты.

Закладваюць агародніну і садавіну да 15 лістапада, а рэалізоўваюць да 31 мая. Гэта доўгі міжсезонны перыяд, але варта адзначыць, што леташняя прадукцыя доўгі час захоўвалася і заставалася якаснай. Былі рэшткі, таму рэалізацыя працягвалася нават летам. Усё астатняе пайшло на перапрацоўку. Гэта сведчыць аб тым, што матэрыяльна-тэхнічная база прадпрыемства адпавядае патрабаванням захоўвання, што прад'яўляюцца для кожнага віду прадукцыі.

Сёння на прадпрыемства паступіла новая партыя морквы. Яна прайшла ўсе этапы і рыхтуецца да змяшчэння ў сховішча. Паралельна ў невялікіх кантэйнерах сартуецца бульба. Калі клубні шустра мчаць па стужцы канвеера, тры жанчыны спрытна паспяваюць правяраць іх на дэфекты і вызначыць якасныя, якія затым фасуюцца ў мяшкі-сеткі. Так ідзе перадпродажная падрыхтоўка.

Прадукцыя стабілізацыйнага фонду традыцыйна будзе накіроўвацца ў арганізацыі гандлю, грамадскага харчавання, дзіцячыя дашкольныя ўстановы і камбінат школьнага харчавання Мінска.

## НАВУКА НАМ ДАПАМАГАЕ

«Больш за дзве трэціны валавога збору агародніны ў краіне ажыццяўляецца ў асабістых дапаможных гаспадарках. Тут правільную работу праводзіць Белкаапсаюз, які скупляе прадукцыю ў насельніцтва і ўцягвае ў абарот. Гэта добрая дапамога для харчовай бяспекі нашай краіны. Яшчэ адна трэціна агародніны вырабляецца на прамысловай аснове — у сельскагаспадарчых арганізацыях і фермерскіх гаспадарках. Яна мае высокую таварнасць, выкарыстоўваецца на ўнутраным рынку і пастаўляецца за мяжу», — сказаў гэтымі днямі **дырэктар Інстытута агародніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Андрэй ЧАЙКОЎСКІ** падчас круглага стала ў прэс-цэнтры БелТА.

Селекцыянеры Інстытута агародніцтва НАН вядуць бесперапынную работу па стварэнні новых сартоў агародніннных, бахчавых і вострапахучых культур. Пры стварэнні сартоў і гібрыдаў вялікая ўвага аддаецца смакавым уласцівасцям, устойлівасці да ўзбуджальнікаў і хвароб.

**Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута пладаводства НАН Беларусі Анатоль КРЫВАРОТ** адзначыў, што навукоўцы працуюць таксама над пашырэннем асартыменту пладова-ягаднай прадукцыі для беларускага спажыўца. У інстытуце выведзены новыя сарты глогу, актынідыі і бружмелю. Нядаўна адбылося пасяджэнне вучонага савета, дзе рэкамендавалі да праходжання выпрабаванняў і ўключэння ў рэестр новага сорту персіка. У нашай краіне таксама створаны айчынныя сарты фундуку «лал» і «яшма».

## ХОПІЦЬ САБЕ І НА ПРОДАЖ

Калі казаць у цэлым па краіне, то «другога хлеба» ў нас будзе дастаткова. Сёлета ў гаспадарках усіх катэгорый чакаецца вытворчасць бульбы на ўзроўні 6,1 млн тон, пладоў і ягад — 601 тысяча тон, агародніны — 1,8 млн тон. У тым ліку ў сельгасарганізацыях і фермерскіх гаспадарках плануюць атрымаць 1,1 млн тон бульбы, 170 тысяч тон пладоў і ягад, а таксама 625,5 тысячы тон агародніны.

Дарэчы, ужо зараз у сельгасарганізацыях сабрана больш за 700 тысяч тон бульбы (ураджайнасць — 284 ц/га). Агародніна з адкрытага грунту ўбрана з 79 % запланаваных плошчаў, дзе сабрана 110 тысяч тон. Што датычыцца пладоў і ягад, у сельгасарганізацыях сабрана каля 66 тысяч тон з крытага і абароненага грунту.

З чаканых 1,1 млн тон бульбы 185 тысяч тон пойдзе на насенне, каля 200 тысяч тон адправяць на прамперапрацоўку, 171 тысячу тон — на патрэбы гандлю і грамадскага харчавання (у тым ліку для закладкі ў стабілізацыйныя фонды), астатняе — для іншай рэалізацыі, уключаючы экспарт.

## КАБ ЯБЛЫКІ НЕ СТАЛІ «ЗАЛАТЫЯ»

Самазабеспячэнне яблыкамі ў нашай краіне складае амаль 50 %, адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання — начальнік аддзела спажывецкага рынку Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля МЕЛЬНІКАВА.**

З практычна 3 тысяч сялянскіх гаспадарак толькі 40 % займаюцца вытворчасцю яблыкаў. Пакуль мы яшчэ не ў поўным аб'ёме забяспечваем насельніцтва яблыкамі. Таму штогод закладваюцца новыя сады. За 2016—2019 гады пасаджана 3,3 тысячы га, сёлета — ужо 315 га, і работа яшчэ працягваецца. За апошнія 10 гадоў зрабілі значны рывок у гэтым кірунку. У параўнанні з 2010 годам вытворчасць пладова-ягаднай прадукцыі ў грамадскім сектары павялічылася ў 4,2 раза. Вялікія аб'ёмы вытворчасці сканцэнтраваныя ў фермерскіх гаспадарках, дзе адзначаны рост плошчаў больш чым у 13 разоў.

Па словах спецыяліста, яблыкі адносяцца да сацыяльна значных тавараў. «У мэтах гарантаванага забеспячэння насельніцтва імі ў нас устаноўлена дзяржаўнае цэнавае рэгуляванне да 31 снежня 2020 года. На яблыкі вызначана гандлёвая надбаўка (з улікам аптовай) не больш за 30 працэнтаў. Гэта павінны выконваць усе арганізацыі гандлю.

Што датычыцца бульбы і іншай агародніны, іх вытворчасць у Беларусі значна перавышае патрэбу. «Па разліковых даных, патрэба ўнутранага рынку ў бульбе ў 6–7 разоў меншая за вырашчаныя аб'ёмы, у іншай агародніне — у два разы. Доля продажу арганізацыямі гандлю ад агульнага аб'ёму вытворчасці бульбы складае толькі 0,1 %, іншай агародніны — ад 20 да 60 працэнтаў», — адзначыла Наталля Мельнікава.

## З ХОЛАДУ Ў ЛЕТНЯЕ ЦЯПЛО

«Партызанскае» трымае руку на пульсе стратэгічнага запасу нашага мегагорада. Там тэмпература блізкая да нуля. Але ёсць таксама сталічнае сховішча для агародніны, дзе пануе іншая абстаноўка. На тэрыторыі аб'екта «прапісаліся» не складскія памяшканні, а цяплічныя. Нядзіўна, бо тут цэлы год вырошчваюць агародніну, зеляніну і травы на абароненым і адкрытым грунце.

На палях тут вырошчваюць бульбу, буракі, капусту, цыбулю рэпчатую, а на закрытых плошчах — таматы, агуркі, перац, баклажаны, розную зеляніну накшталт салаты, пятрушкі, базіліку, а таксама разнастайныя духмяныя травы.

**Галоўны тэхнолаг Мінскай агародніннай фабрыкі Уладзімір УЛАДЗІМІРАЎ** адзначае, што працаваць па ўсіх кірунках раслінаводства нялёгка. Ураджай мала сабраць, яго трэба і рэалізаваць. На дапамогу прыходзіць маркетынгавы аддзел, які вывучае запыты, аналізуе і прапануе ідэі менавіта таго, што неабходна спажыўцам.

Хутка спіс прадукцыі агародніннай фабрыкі папоўніцца — тут плануецца высаджваць кактэйльныя памідоры і Чэры-таматы, бела-зялёныя агуркі, салату з антацыянавай афарбоўкай і вострапахучыя культуры — мангольд, шпінат і кінзу. Працуюць на фабрыцы напрамую са сталічнымі рэстаранамі і кафэ, якім пачалі прадаваць амаль «ювелірныя» сарты карнішончыкаў.

«У кастрычніку мы пачынаем вырошчваць агуркі, ужываючы тэхналогію святлакультуры. Гэта значыць, што зімой будзе ўраджай і жыхары сталіцы змогуць купіць гэтую агародніну беларускай вытворчасці да навагодняга стала. Роўна як і свежая салата і рэзкаараматычныя культуры — кроп, пятрушка і базілік, якія фасуюцца ў фірмовыя пакеты і адпраўляюцца на прылавак», — расказала **вядучы аграном па харчаванні фабрыкі Людміла ЯЦКЕВІЧ.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Віталь і яго Габрыэла







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**...З ратавальнікам-кінолагам Цэнтра пошукава-выратавальных работ і пажаратушэння Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС Віталем АРЛОВЫМ** мы сустракаемся на паласе перашкод. Тут яго выхаванец — васьмігадовы лабрадор па мянушцы Габрыэла — праходзіць цераз лесвіцы, трубы, упэўнена бярэ бар'еры. На Габрыэлу глядзіць маладое шчанё па мянушцы Тая. І спрабуе да яе прарвацца. Таі ўсяго чатыры месяцы.

— Спачатку Габрыэла жудасна раўнавала. Я ж памятаю, якой я яе прынёс сюды ўпершыню. Гэта было маленькае двухмесячнае безабароннае шчанё. Менавіта ў такім узросце выяўляюцца пэўныя задаткі, якія пасля мусіць развіць кінолаг. І з таго часу мы з ёй заўжды разам. Але нічога, два лабрадоры звыкліся і нават гуляюць разам. Трэніроўкі ў нас ідуць па шэсць гадзін у дзень. На першы погляд, гэта шмат, але сабака, з якім ходзіць кінолаг, мусіць быць вельмі вынослівы. Справа ў тым, што калі кіналагічны разлік выязджае на пошук людзей, то мы можам сутыкнуцца з якой заўгодна мясцовасцю. Лес, палі, меліярацыйныя каналы... І пошукі чалавека могуць доўжыцца не адну гадзіну.

Віталь Арлоў прапаноўвае паказаць, як сабака можа знайсці пацярпелага ў завале. Ролю апошняга выконвае імправізаваны «трэнажор» — калі яго можна так назваць. Гэта бетонныя блокі, якія навалены адзін на другі. Але пры гэтым там ёсць некалькі месцаў, дзе можа схавацца чалавек. Перахаваўшыся, што імправізаваны «асістэнт» схаваўся належным чынам і сабака яго не бачыць, кінолаг адвязвае Габрыэлу і дае каманду «Шукай!». Лабрадор пачынаеісці па блоках без якойсьці боязі. І праз некаторы час, засунуўшы нос у чарговую адтуліну, чатырохногая памочніца сядае і пачынае брахаць. І сапраўды, менавіта тут і схаваўся «асістэнт». А ў якасці ўзнагароды Габрыэла атрымала смачны шарык.

— Але мы правялі сённяшні занятак, так бы мовіць, па скарочанай праграме. Вось давайце ўявім сабе рэальную сітуацыю абрушэння дома. На сабачы нос будуць уплываць і іншыя пахі — хоць бы ад прадуктаў харчавання і чужых прадметаў. Вось мы і раскладваем пакуначкі з ежай, каб прывучыць сабаку на іх не рэагаваць. Усё-такі ў падобных сітуацыях дарагая кожная секунда.

Габрыэла — другі сабака ў Віталя Арлова. Ён працуе кінолагам ужо больш за сямнаццаць гадоў. Як згадвае ратавальнік, ён любіў працаваць з сабакамі яшчэ да службы ў войску, пасля якой і прыйшоў у Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Самы першы баявы выезд у Віталя Арлова адбыўся яшчэ ў студзені 2004 года. Пунктам прызначэння стала Краснаполле. А дакладней — мясцовая школа, дзе пад цяжарам снегу абваліўся дах спартыўнай залы. Пад заваламі тады загінуў настаўнік фізкультуры і трое вучняў.

— Я знаходзіўся дома пасля дзяжурства, — успамінае Віталь Арлоў. — Раптам каля дзясятай гадзіны раніцы мне тэлефануюць і пытаюцца, ці дома я і ці са мной сабака. Справа ў тым, што мы часам бяром з сабой нашых памочнікаў з вальераў — яны павінны прывыкаць у тым ліку і да перамены абстаноўкі. Калі яны будуць заставацца ўвесь час тут, то не будуць апасацца толькі гэтых самых вальераў. А так яны прывыкаюць да транспарту, ліфтаў, лесвіц.

Дык вось, на абодва пытанні я адказаў сцвярджальна. У трубцы пачулася: «Чакай, па цябе прыедуць». І больш ніякай інфармацыі не было. Нас прывезлі на аэрадром. Тут я зразумеў, што адбылося нешта сур'ёзнае. Ужо падчас палёту даведаўся, што ляцім у Краснаполле. У самой школе я падняўся на другі паверх, каб ацаніць абстаноўку і зразумеў, што ўсё вельмі складана. Людзі спрабавалі разабраць завалы рукамі. А ў маім выпадку яны б перашкодзілі рабоце сабакі, таму я папрасіў іх усіх выйсці. І настала такая цішыня, што я чуў, як на гарачых лямпах раставалі сняжынкі...

Віталь Арлоў тады дзякуючы чатырохногаму памочніку знайшоў тры месцы, дзе маглі знаходзіцца людзі. Так яно і аказалася — але школьнікам ужо нічым нельга было дапамагчы...

Спецыфіка сабак, якіх выкарыстоўваюць кіналагічныя разлікі ратавальнікаў, у тым, што ў іх павінна цалкам адсутнічаць агрэсія. Менавіта таму выбар выпаў на лабрадораў. Тым больш што яны цудоўна паддаюцца дрэсіроўцы і цалкам паслухмяныя свайму гаспадару.

Праўда, бывае так, што кінолаг і сабака не «ўжываюцца». Зрэшты, гэта бачна па некалькіх першых месяцах паводзін, калі абодва члены разліку «прыцІраюцца» адзін да аднаго.

— «Прышчапіць» нейкія якасці сабаку нельга. Яны або ёсць ад прыроды, і тады трэба імкнуцца іх развіць, або іх няма. Сабака мусіць быць паслухмяны да такой ступені, каб нават аддаць сваю ўлюбёную цацку.

— «А ну, выплюнь мячык!» — звяртаецца кінолаг да свайго выхаванца. Не хочучы, але Габрыэла выпускае з зубоў чырвоны мячык з ланцужком...

* * *

Кіналагічны разлік, пра які мы расказвалі, для Беларусі ўнікальны. Справа ў тым, што Габрыэла — дыпламаваны сабака-тэрапеўт. Разам з Віталем Арловым яна перыядычна ездзіць да дзяцей у прытулкі, спецыялізаваныя цэнтры. Догатэрапія — гэта псіхатэрапеўтычная методыка. Дзякуючы ёй у дзяцей паляпшаюцца маторыка і рухальныя функцыі. А малыя з нестандартнымі асаблівасцямі развіцця лепш адаптуюцца ў грамадстве.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**







# НЕВЯДОМЫЯ ТАНКІСТЫ З БАБРУЙСКА

## Юныя даследчыкі ўшаноўваюць подзвіг курсантаў, якія трымалі абарону на Бярэзіне ў чэрвені 1941-га

**«Немцы ў гэты дзень (30 чэрвеня 1941 года) з раніцы фарсіравалі Бярэзіну каля Бабруйска. Іх стрымлівала ў пешым страі расцягнутае на дванаццаць кіламетраў Бабруйскае вучылішча, якое на наступны дзень, калі немцы канчаткова пераправіліся, і палегла там, у лясах, у няроўным баі...» — пісаў Канстанцін Сіманаў у сваіх успамінах. Размова ідзе пра курсантаў ваенна-трактарнага вучылішча, якое існавала ў Бабруйску з 6 студзеня 1941-га да дня акупацыі горада. На думку бабруйскіх даследчыкаў са школы № 25, гэтая тэма яшчэ цалкам не вывучаная, а памяць 19-гадовых герояў недастаткова ўшанаваная. Сёння, дзякуючы школьнікам, на месцы бою ўстаноўлены памятны знак і нават распрацаваны спецыяльны турыстычны маршрут.**



Патрыятызм выхоўваецца ў палявых умовах.

### КАРЦІНА БОЮ ПА ЛІСТАХ

Настаўніца матэматыкі Валерыя Ткачук па натуры сама краязнавец і сваім прыкладам натхняе вучняў. На краязнаўчых конкурсах яны заўсёды займаюць прызавыя месцы. Шэсць гадоў таму сын настаўніцы — Антон Ткачук, які зараз студэнт Мазырскага педуніверсітэта імя І. Шамякіна, а тады яшчэ вучань восьмага класа — зацікавіўся гісторыяй абароны Бабруйска. Пра вызваленне горада інфармацыі шмат, а вось па абароне — кот наплакаў. І хоць яна была нядоўгая — горад быў узяты 28 чэрвеня, зафіксавана шмат гераічных учынкаў. У журнале баявых дзеянняў гаворыцца пра тое, як курсанты вучылішча вядуць разведку ва ўжо захопленым немцамі Бабруйску і пра тое, як у адной з такіх разведак курсант Іваноў, атрымаўшы чатыры раненні, сыходзячы крывёй, знайшоў сілы пераплыць раку і перадаць каштоўныя звесткі. А ў апаратыўнай зводцы за 30 чэрвеня адзначаецца, што ўначы з 29-га на 30-е чэрвеня спробы немцаў пераправіцца праз Бярэзіну былі адбітыя. У складзе зводнага палка, які трымаў там абарону, змагалася больш чым 400 курсантаў.

— Мы вырашылі максімальна высветліць усё, што яшчэ можна знайсці пра гэтых герояў, — заўважае Валерыя Ткачук. — Дарэчы, ваенна-трактарным гэтае вучылішча стала менавіта ў Бабруйску. Да 6 студзеня 1941-га яно дыслацыравалася ў Асіповічах і называлася ваенна-пяхотным. Маладыя хлопцы вывучалі найноўшыя ў той час трактары «Камсамолец», на базе якіх потым і быў распрацаваны лёгкі танк. Першы выпуск адбыўся 10 чэрвеня 1941-га, але не ўсе курсанты паспелі раз'ехацца па дамах і воінскіх часцях. У краязнаўчым музеі нам далі некалькі папак перапіскі былога старшыні ваенна-навуковага таварыства Бабруйскага гарнізоннага Дома афіцэраў Мікалая Данілава з людзьмі, якія ўдзельнічалі ў абароне на Бярэзіне ў чэрвені 41-га. Там мы прачыталі пра падрабязнасці бою, у тым ліку і ад курсантаў ваенна-трактарнага вучылішча. Тыя, каму пашчасціла выратавацца, пісалі Мікалаю Данілаву, у якое пекла яны тады трапілі.

Па гэтых лістах Антон Ткачук паспрабаваў аднавіць карціну бою. Карта цалкам супала з той, якую ён потым знайшоў у Данілава. Поле, дзе курсанты прынялі бой, знаходзіцца на левым беразе Бярэзіны паміж новым і старым мастамі. Гэта якраз насупраць сённяшняга санаторыя імя Леніна. Калі даследчыкі ўпершыню прыйшлі на гэтае месца, то знайшлі там невялікі помнік. Высветлілася, што яго на ўласныя сродкі паставіў жыхар Бабруйска Міхаіл Казачонак. Ён і зараз жыве непадалёк ад таго поля — на вуліцы Берагавой. Мужчына згадваў, што ў дзяцінстве аблазіў гэтыя мясціны ўдоўж і папярок. Малому было цікава, адкуль там магіла і драўляны крыж. Старажылы казалі, што пад ім пахаваныя курсанты. Калі крыж згніў, мужчына са сваімі сынамі заказаў помнік з мармуровай крошкі.

### «ТАМ УСЁ ПОЛЕ «ФАНІЦЬ»

Помнік на левым беразе Бярэзіны стаў своеасаблівым месцам памяці, дзе настаўнікі і вучні 25-й школы адзначалі ганаровыя даты. Тут прымалі ў піянеры, ускладалі кветкі на Дзень Перамогі, праводзілі гадзіны мужнасці. Але аднойчы, калі яны прыйшлі правесці чарговае патрыятычнае мерапрыемства, помніка на месцы не



Валерыя Ткачук таксама часам пераапранаецца ў ваенную форму.

аказалася. Сталі высвятляць, у чым справа, і даведаліся, што астанкі курсантаў эксгумавалі і перапахавалі на тэрыторыі Бабруйскай крэпасці. А помнік — прыбралі. Гэта несправядліва, палічылі даследчыкі, і адправіліся ў гарвыканкам з патрабаваннем яго вярнуць.

— Мы вырашылі, што месца павінна быць неяк адзначана, бо паводле некаторых даных там знікла без вестак каля 166 курсантаў, не кажучы пра іншых удзельнікаў абароны, — канстатуе Валерыя Янаўна. — Адзін курсант пісаў, што бачыў поле бою пасля атакі. Яно было ўсыпана трупамі курсантаў. Міхаіл Казачонак казаў, што калі там пракладвалі газ, коўш вывернуў з зямлі шмат чалавечых астанкаў. А яшчэ там ёсць возера Снарад — стары кар'ер. Яно ўтварылася, калі капалі пясок для будаўніцтва моста. Кажуць, там таксама было шмат астанкаў. Гэтае поле бою ўсё «фаніць» ад зарытага ў ім металу.

Школьнікаў, якія прыйшлі на прыём у гарвыканкам, падтрымаў Савет ветэранаў. І летась на левым беразе Бярэзіны з'явіўся памятны знак. На адкрыцці прысутнічалі і родныя некаторых курсантаў. Ніна Кісялёва, пляменніца Паўла Карманнага, жыве зараз у Бабруйску, а вось Віва Вартанаўна — дачка капітана Саваяна, які выкладаў у вучылішчы артпадрыхтоўку, прыехала з Ерэвана. 80-гадовую жанчыну вельмі кранула тое, што ў Бабруйску не забываюць пра курсантаў і іх выкладчыкаў. Пасля таго, як на сайце мясцовай газеты з'явілася інфармацыя пра памятны знак, з горада Дзятлава Гродзенскай вобласці адгукнулася яшчэ адна жанчына. У яе захаваўся ліст курсанта гэтага вучылішча ад 13 мая 1941 года, дзе ён апісваў сваё жыццё і вучобу. «Гэта вельмі цікавыя факты, бо з ліста можна даведацца, як жылі курсанты ў мірны час, — кажа Валерыя Ткачук. — Ён пісаў, дзе яны адпачывалі, як гулялі ў парку, як рабілі марш-кідкі. Разам з вучнем шостага класа Мікітам Канавалавым мы напісалі яшчэ адну даследчую работу па гэтай тэме, і ён заняў другое месца на гарадскім конкурсе. Работа выйшла за рамкі школы, ёй зацікавіўся гарадскі Цэнтр турызму, краязнаўства і экскурсій. Быў распрацаваны маршрут па месцах, дзе змагаліся курсанты вучылішча, у тым ліку і ў фармаце анлайн, каб нават ва ўмовах пандэміі было магчыма з ім азнаёміцца».

### ТРАГЕДЫЯ АСОБНАЙ СЯМ'І

Валерыя Ткачук перакананая, што менавіта на такіх прыкладах выхоўваюцца сапраўдныя патрыёты. Прычым без нейкага там прымусу. Яна згадвае эпізод, калі падчас падрыхтоўкі да чарговага краязнаўчага конкурсу на сайце школы быў выкладзены невялікі відэафільм пра выхаванцаў Бабруйскага ваенна-трактарнага вучылішча. Адгукнуліся родныя курсанта Івана Галкіна з Ніжняга Ноўгарада. У пачатку чэрвеня 41-га пасля выпускнога ён паспеў з'ехаць у Магілёў, але застаўся ваяваць і загінуў. Родныя шукалі месца яго апошняга бою і прасілі дапамагчы. «Мяне прыемна здзівіла, што гэтым займалася шаснаццацігадовая дзяўчына, — кажа Валерыя Янаўна. — Анастасія напісала, што Іван — брат яе бабулі. Мы амаль аднагачасова з ёй знайшлі месца, дзе ён загінуў. Жыццё Івана абарвалася ў баі каля вёскі Волма Смалявіцкага раёна. Разам з бацькамі і малодшым братам яна сёлета збіралася прыехаць у Бабруйск, каб паглядзець, дзе вучыўся яе продак, але перашкодзіла пандэмія».

Пошукавая дзейнасць захапляе, прымушае вострa адчуць падзеі шматгадовай даўнасці, а галоўнае — нешта пераасэнсаваць у сваім жыцці, атрымаць магчымасць вярнуць з небыцця імя яшчэ аднаго чалавека. У адным з лістоў перапіскі Данілава даследчыкі знайшлі інфармацыю, што ў раёне Цітаўкі адна жанчына пахавала каля свайго дома загінулага ў баі курсанта-кулямётчыка.

— Былы курсант Якаў Барадаўкін напісаў ліст яшчэ ў 1980-х, але пра яго забылі, — з горыччу кажа Валерыя Ткачук. — Мы вось ужо з зімы займаемся пошукамі гэтага месца. У агенцтве па нерухомасці і зямельным кадастры нам дапамаглі знайсці план участка. Але там ужо ніякага дома няма, нават падмурка. Трэба праводзіць разлікі і ўстанаўліваць межы пабудовы. У лісце курсант піша, што побач з магілай жанчына пасадзіла дрэва. Але і дрэва таго ўжо няма.

### НА ВОГНЕННЫМ РУБЯЖЫ

Хоць тыя курсанты, якія загінулі на левым беразе Бярэзіны, не паспелі сесці за штурвал танка, у школе № 25 вырашылі ўшанаваць іх памяць менавіта на Дзень танкіста, які адзначаецца ў пачатку верасня. Іх падтрымаў клуб рэканструктараў «Бабруйскі рубеж», гарадскі Цэнтр турызму, краязнаўства і экскурсій і асабіста дэпутат Бабруйскага гарсавета Уладзімір Свірыдаў, якому вельмі блізкая тэма вайны. Напісалі сцэнарый, аформілі пляцоўку ў стылі 1940-х і запрасілі дзяцей. Сабралася каля ста дзяўчынак і хлопчыкаў. Для іх арганізавалі страйк-гульню, спаборніцтвы па кіданні гранаты, пераход праз балота, дзе спатрэбілася веданне асноў тапаграфіі і арыентавання. Гэтую навуку курсанты таксама вывучалі. Уладзімір Свірыдаў дапамог арганізаваць выстаўку абмундзіравання і макетаў зброі тых часоў. Актыўны ўдзел у мерапрыемстве прыняў і Антон Ткачук, з якога, па сутнасці, усё і пачалося. Тая школьная даследчыцкая работа абудзіла ў яго цікавасць да Вялікай Айчыннай вайны і выклікала жаданне стаць гісторыкам. Сёння ён — адзін з рэканструктараў клуба «Бабруйскі рубеж» і падчас такіх мерапрыемстваў заўсёды апранае салдацкую гімнасцёрку і галіфэ. На гэты раз Антон распрацаваў квэст па матывах ваенных падзей. Пераможнікам на памяць засталіся кубачкі з эмблемамі танка Т-34 і танкістаў. Быў арганізаваны сапраўдны салдацкі абед на свежым паветры — з кашай, бутэрбродамі і гарбатай. Зараз Антон марыць пачысціць тыя акопы, якія ён знайшоў на месцы былых баёў, умацаваць іх і запрасіць на наступны год усіх ахвотных прасякнуцца тэмай абароны Бабруйска, каб яшчэ раз успомніць пра подзвіг курсантаў мясцовага вучылішча.

Дарэчы, маці з сынам сёлета былі адзначаны ўзнагародамі за захаванне гістарычнай памяці і выхаванне падрастаючага пакалення. Антон атрымаў яшчэ і аналагічную расійскую ўзнагароду, а Валерыі Ткачук уручылі яшчэ і падзячнае пісьмо ад Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Валерыі ТКАЧУК.**

### • У тэму

**Мікалай БАРЫСЕНКА, кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру», ваенны пісьменнік, гісторык:**

— Тэма абароны Бабруйска ў 1941 годзе, асабліва што датычыцца ўдзелу ў ёй курсантаў ваенна-трактарнага вучылішча, сапраўды да гэтага часу была мала вывучана нават ваеннымі гісторыкамі. У 2016 годзе, калі я ў чарговы раз працаваў у Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі і заказаў палітдаnясенні і загады па асабовым складзе вучылішча за 1941 год, мне іх не выдалі. Сакрэтна! Заслугоўвае ўсялякай падтрымкі і ўдзячнасці практычная пошукавая работа рабят і іх кіраўніка Валерыі Ткачук па высвятленні дэталяў баявых дзеянняў з удзелам курсантаў вучылішча падчас абароны Бабруйска. Важна, што яна робіцца не пад прымусам, а ідзе ад асабістых шчырых пачуццяў і жаданняў. Менавіта такім чынам, а не на лозунгах выхоўваецца сапраўдныя патрыёты. Імі становяцца толькі праз спасціжэнне сапраўдных каштоўнасцяў ваеннай гісторыі роднай зямлі.

Асабістае

# «МЯНЕ Ў ПРАФЕСІЮ ПРЫВЯЛІ ПАПЯРЭДНІКІ...»

**Часам тры невялічкія здымкі кажуць больш, чым тры тысячы слоў. Не верыце? Тады глядзіце.**
**На першым фота — мой дзядуля Казімір Купрыяніч Какола, інвалід Вялікай Айчыннай вайны.**



Калі яна пачалася, юнаку было 17 і яго сям'я ва ўсім дапамагала партызанам: у іх доме размяшчаўся штаб атрада імя Дзяржынскага. Потым хлопца прызвалі на фронт: ваяваў у радах дзявятай асобнай штурмавой брыгады сапёраў 1-га Прыбалтыйскага фронту. Вясной 45-га, падчас штурму Кёнігсберга, быў цяжка паранены і адпраўлены ў ваенны шпіталь. Там яму збіраліся ампутаваць руку, аднак вытрымка байца і дапамога ваенных лекараў зрабілі цуд: руку ўдалося захаваць.

Найсвятлейшым у жыцці салдата стаў Дзень Перамогі, а 9 Мая — найбольшым святам. На ўсе часы...

Пасля вайны дзядуля працаваў бухгалтарам на цагельні, вучыўся (завочна) у Гродзенскім педінстытуце, больш за 20 гадоў паспяхова настаўнічаў у Зенявіцкай васьмігодцы.

...Аб тым, як цяжка тады працавалася настаўнікам, шмат расказвала і мая бабуля Марыя Андрэеўна. Будынак быў паўразбураны, без ацяплення, і выкладаць ёй даводзілася ў двух класах па 30 чалавек, прычым — адначасова. Дзеці (у вопратцы) па шэсць чалавек сядзелі на лаўках за звычайнымі сталамі.

«...Там, дзе добры настаўнік, там добра выхаваны і вучні». З гэтым дэвізам на працу ў дзядулеву школу прыйшла і мая мама Ала Міхайлаўна Какола. Яна была піянерважатай, выкладчыцай беларускай мовы і літаратуры, дырэктарам Зенявіцкай, а потым Бенінскай сярэдніх школ, чалавекам, адданым сваёй прафесіі.

...Я прыйшла ў школу, калі мне споўнілася тры гады. Пакуль мама праводзіла ўрокі, я ціхенька сядзела за апошняй партай.

У свой клас, дзе вучыліся меншыя дзеткі, мяне запрашала і бабуля. А таму не дзіва, што, вярнуўшыся дамоў, я рассаджвала за сталом сваіх лялек і вучыла іх таму, што ўмела сама: заводзіла журнал, ставіла адзнакі. Ужо тады я цвёрда ведала, што таксама буду настаўніцай.





Гэта мара збылася: скончыўшы Гродзенскі ўніверсітэт імя Янкі Купалы, я працую ў Навагрудскай спецшколе-інтэрнаце. Дзеці тут розныя, і ў нас, выхавацелях, яны бачаць не толькі педагогаў, але і старэйшых таварышаў, лідараў, якія ўмеюць натхніць на добрыя справы, павесці за сабой...

Мяне — у тым ліку ў прафесію — прывялі папярэднікі. Я вельмі ўдзячная ім, бо цяпер кожны мой працоўны дзень напоўнены галасамі дзяцей, іх звонкім смехам, жаданнем пазнаваць невядомае. І я ў гэтым магу дапамагчы.

**Іна ПЕТУШКОВА,**
*г. Навагрудак.*

Думаю так

# КАБ ВУЧЫЦЬ, ТРЭБА ВУЧЫЦЦА

**Немалая ўвага ў нашых школах надаецца прафарыентацыі: праводзяцца класныя гадзіны, сустрэчы, гутаркі. Робіцца гэта для таго, каб дапамагчы вучням сарыентавацца, не памыліцца ў выбары.**

Яго, як вядома, дзеці робяць змалку: яшчэ ў пачатковых класах яны цікавяцца, што трэба зрабіць для таго, каб працаваць урачом, кіроўцам, артыстам...

Вось і на апошняй класнай гадзіне адна з другакласніц спытала, як стаць настаўніцай? Я звыкла адказаў, што для гэтага трэба добра вучыцца ў школе, затым скончыць педагагічны ўніверсітэт або каледж...

Адказаць-то адказаў, аднак потым стала неяк не па сабе, бо як ні круці, а трохі схібіў. Справа ў тым, што я ведаю і ведаю настаўнікаў, якія не маюць адпаведнай спецыяльнай адукацыі, але працуюць... Праўда, па рознаму: адны — яшчэ як, другія...

З прыкрасцю ўспамінаю міжволі падслуханую неяк размову. Адбылася яна ў цягніку, і вялі яе дзве жанчыны. Адна скардзілася, што настаўніца неаб'ектыўна, несправядліва ацэньвае веды яе дачкі, ды і наогул у адносінах з дзецьмі паводзіць сябе няправільна. Другая жанчына — была цалкам згодная, бо яе дзіця вучылася ў тым жа класе...

Пад канец размовы гэтыя матулі прыйшлі да высновы, што настаўніца, нягледзячы на вялікі працоўны стаж, педагогам усё ж не з'яўляецца, бо не мае спецыяльнай адукацыі...

Я, вядома ж, не магу разважаць аб тым, хто ў гэтай гісторыі мае больш рацыі — матулі альбо настаўніца, але тое, што паміж імі няма належнага кантакту, здаецца, відавочна.

А таму лічу, што, мусіць, нядрэнна было б ва ўсіх установах адукацыі на бачных месцах размяшчаць інфармацыю аб настаўніках, якія там працуюць: пра іх адукацыю, стаж, катэгорыю. Каб кожны з бацькоў мог ведаць, каму давярае навучанне свайго дзіцяці.

Ну а педагогі без спецыяльнай адукацыі, па-мойму, павінны паступіць вучыцца. Я ведаю калег, якія рабілі гэта ў 40, 50 і нават больш гадоў.

**Анатоль АСКІРКА, настаўнік,**
*г. Быхаў.*

Землякі

# «...Нельга адвыкнуць ад роднага неба»

**...Гэты год быў надзвычай багаты на грыбы. Ходзіш па лесе, збіраеш іх, любуешся і міжволі ўспамінаеш вядомае:**

*За Любанем растуць баравікі —*
*У негрыбную пору вестку чую,*
*Ну, як я з ёю ноч пераначую,*
*Калі цяпер пайшоў бы напрасткі*
*У бор знаёмы, пералесак ніцы,*
*У тое лета, дзе даўно не быў?!*
*Там столькі дзён маіх і светлых дзіў,*
*Нібыта на мурашніку ігліцы...*



У гэтым, адным з самых вядомых вершаў нашага земляка Уладзіміра Паўлава арганічна з'ядналіся і гісторыя, і роздум аб набалелым, і любоў да роднага краю: з вёскі Замошша гэтага простага хлапчука сцежка вывела на шырокую «Узлётную паласу» паэтычнай творчасці, а ўжо адтуль і сам ён убачыў, і іншым паказаў свае «Далягляды», «Светацені», «Слязу на вейцы», «Чысты чацвер» і многае, многае іншае...

Своеасаблівым, можна сказаць, паўлаўскім жанрам сталі яго паэтычныя «атожылкі» — мудрыя думкі, якія нараджаліся ад пакут і хваляванняў:

*Светлы світанак са скібачкай хлеба,*
*З белай іскрынкай забытае солі.*
*...Нельга прывыкнуць да нізкае столі,*
*Нельга адвыкнуць ад роднага неба.*

Уладзімір Паўлаў — творца са сваім, адметным голасам, з чуйным сэрцам. У сваё 85, нягледзячы на хваробы, ён шчаслівы і як чалавек, і як паэт: яго верш стаў гімнам Любаншчыны, яго творы вывучаюцца ў школе, да яго творчасці будуць звяртацца нашчадкі, бо...

*За белым туманам сваім пакланюся гадам.*
*Я хутка вярнуся, я зораў для вас налаўлю*
*І з поўных прыгоршчаў*
*на добрую памяць раздам.*

**Васіль КАТКАВЕЦ,**
*Любанскі раён.*

Свой погляд

# У прадуктах галоўнае — смак, але...

**Гэта з публікацый «Звязды»: дзіця не зразумела беларускае «калі ласка» і кінулася ў плач: маўляў, якая я вам каляска?.. Дарослыя людзі папрасілі кавы з вяршкамі і пачулі: «З верхам жа наліта!» У краме з тэхнікай прадаўцы не ведалі, што такое прас...**

На памяці гэтыя карцінкі — як я зразумела, з гарадскога, сталічнага жыцця. Да іх жа дадам вясковую.

Неяк у нашу краму зайшоў імпазантны мужчына ў чорна-карычневай скуранай куртцы, бегла агледзеў паліцы з таварам і досыць нядобрым словам (назавём яго так) назваў нашы фабрыкі па вытворчасці прысмакаў: цукерак, шакаладу...

Мы ўсе, хто быў тады ў краме, вядома ж, здзівіліся, абурыліся, а я дык нават не ўтрымалася, спытала: «Чым жа яны вам не дагадзілі?!»

Мужчына, як выглядала, з ахвотай уступіў у размову, сказаў: «Ды дзецям няма чаго выбраць. Мы ў Піцеры жывём, на матацыклах вельмі шмат куды ездзім. Дочкі пакуль дома застаюцца... Дык мы ім з кожнай вандроўкі стараемся нешта прывезці: лялькі ў нацыянальных строях, сувеніры, мясцовыя прысмакі... А ў вас і купіць няма чаго». — «Няўжо нічога не падабаецца?!» — не паверылі мы таму байкеру. «Ды наадварот, — запэўніў ён. — Я сам, як мядзведзь да салодкага: не меншы аматар, чым мае двайняты. Так што ў Беларусі, можна сказаць, адарваўся: шмат што купляў, з асалодай еў...» — «Дык у чым тады справа? Што не падабаецца?» — не разумелі мы. — «А тое, што на ўсіх абгортках рускія словы. Адкуль дзецям ведаць, што шакаладкі я не з суседняй крамы прынёс ці прывёз не з Самары? Скажаце, дробным шрыфтам напісана? А чаму б не буйным? Каб здалёк відаць было!»

Вось тут мы ўжо не знайшлі, што сказаць, апроч таго, што ў прадукце галоўнае ўсё-такі смак, яго якасць, а не абгортка...

Але ж, як выглядае, і з абгорткай нам трэба нешта рабіць, бо выбіраеш у краме тавар і не разумееш: часам з абодвух бакоў аднолькавыя і «карцінкі» і надпісы — па-руску...

Больш за ўсё тады здзіўляюць словы «Купляйце беларускае!» альбо «Зроблена... (а то і «*сделано*») у Беларусі!» Значыць, ганарымся мы сваёй прадукцыяй, а вось мовы чамусьці сароміемся...

**Ганна КАГАРКА,**
*Астравецкі раён.*

Чалавек — чалавеку

# БЫЎ БЫ САД... І ЯБЛЫКІ БУДУЦЬ

**...Гэтае дрэўца Антось заўважыў гады тры таму. Заядлы паляўнічы і грыбнік, ён часцяком кіраваў да найбліжэйшага лесу, дзе ведаў, здавалася, кожнае дрэўца. Ды вось жа — позірк наткнуўся на тоненькі ствол з дзясяткам-другім зялёных лісточкаў. «Яблынька?» — не верачы сабе, здзівіўся Антось і нават прыўстаў на калена — прыгледзеўся да кары: так і ёсць, яна, побач з вёскай, ды ўсё ж у лесе.**

З той пары ён зачасціў на паляну, каб праведаць, пацешыцца, што расце, але неяк...

У тую суботу ён ішоў да яблынькі з поўнай карзінай баравікоў і на... гук бензапілы. З ёй на паляне шчыравалі двое мужчын у куртках работнікаў лесу, трэці — садзіўся ў кабіну трактара, заводзіў яго... Ехаў — у бок Антосевай яблынькі. «Стой! Стой!» — штосілы закрычаў грыбнік, панёсся следам і з палёгкай уздыхнуў: дрэўца было жывое — трактар не зачапіў яго, праехаў у некалькіх сантыметрах!..

Праз месяц, калі настала спрыяльная пара, Антось прыйшоў на паляну з рыдлёўкай, акуратна выкапаў дрэўца, паставіў у аб'ёмісты пакет і панёс дадому. «Тут цябе ніхто не пакрыўдзіць», — паабяцаў яблыні, і яна, падобна, паверыла.

**Віктар САБАЛЕЎСКІ,**
*г. Узда.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# Вены пад ударам

## Чым небяспечны варыкоз, і што будзе, калі хваробу запусціць

**Варыкознае расшырэнне вен — не знешні дэфект, а сур'ёзная хвароба, якая пагражае цяжкімі ўскладненнямі, такімі як трамбоз, што можа скончыцца летальна.
Чаму яе нельга вылечыць таблеткамі, мазямі ці адварамі траў? Па якіх прычынах гэта больш жаночая праблема? Як вызначыцца, ці рабіць аперацыю, і што бывае, калі не лячыць хваробу?
На гэтыя і іншыя пытанні адказаў навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гурбаніджад Гумен ГУШАНГ.**

***— Доктар Гумен, вы нейрахірург. Чаму ў коле вашых навуковых інтарэсаў з'явілася варыкознае расшырэнне вен?***

— Калі чытаю лекцыі на кафедры неўралогіі і нейрахірургіі, заўсёды тлумачу ўрачам, што арганізм варта разглядаць цалкам, а не часткамі, бо ўсе органы ўзаемазвязаны. Калі лячыць адзін орган, не звяртаючы ўвагі на астатнія, можна атрымаць цяжкія ўскладненні, нягледзячы на тое, што лячэнне для гэтага асобна ўзятага органа было падабрана правільна. Нейрахірургічная аперацыя, як, зрэшты, і любая іншая, павялічвае рызыку ўтварэння тромба. Наш арганізм не ўмее адрозніваць, гэта аперацыя ці крывацёк. Ён не разумее, што аперыруе хірург, побач анестэзіёлаг і ўсё пад кантролем, а ўспрымае гэта як крывацёк, які варта спыніць. А паколькі аперацыя цягнецца доўга, арганізм пачынае згушчаць кроў усё мацней і мацней. І актывізуе спыненне крывацёку да такой ступені, што кроў пачынае згусаць. І калі тромб адрываецца, чалавек атрымлівае ўскладненне — тромбаэмбалію лёгачнай артэрыі, што можа скончыцца летальна. Атрымліваецца, што аперацыя на галаўным мозгу прайшла выдатна, але ўзнікла тромбаэмбалія лёгачнай артэрыі, і чалавек загінуў.

> **«Любое лячэнне пачынаецца з добрай прафілактыкі. Калі прыходзіце дадому, асабліва пасля доўгага стаяння, трэба проста паляжаць на канапе, крыху прыўзняўшы ногі — хвілін 20, каб разгрузіць вены на ніжніх канечнасцях».**

Таму варыкознае расшырэнне вен (а менавіта на ніжніх канечнасцях вялікая рызыка ўтварэння тромбаў) — праблема для любога хірурга. У нейрахірургіі даводзіцца дасканальна вывучаць варыкознае расшырэнне вен. Гэта мая навуковая тэма, над якой я дагэтуль працую і дасягнуў пэўных вынікаў.

***— Варыкознае расшырэнне вен — агульная праблема ці больш жаночая?***

— Пераважна жаночая. Калі прыбраць спадчынную прычыну, якая выклікае захворванне і ў мужчын, і ў жанчын, то яшчэ адным важным фактарам з'яўляюцца гарманальныя змены падчас цяжарнасці. Хоць такія змены могуць з'яўляцца нават у дзяўчынак пасля палавога саспявання, калі пачынаюцца месячныя — і вены на нагах могуць мяняцца, хоць родаў яшчэ не было. Натуральна, з другой паловы цяжарнасці гэта праблема ў многіх абвастраецца. Калі жанчына прымае супрацьзачаткавыя сродкі, яна таксама правакуе ўтварэнне варыкознага расшырэння вен. Жаночы арганізм — гармоназалежны. І гэта моцна ўплывае на развіццё захворвання.

У маладым узросце для любой жанчыны самая галоўная зброя — яе прыгажосць. Хочацца насіць кароткія спадніцы, добра выглядаць на пляжы, і важна, каб былі прыгожыя ногі. Натуральна, дзяўчатам не падабаецца, калі з'яўляецца сасудзістая сетачка. Хоць гэта яшчэ і не варыкознае расшырэнне, а так званая нулявая стадыя, або рэтыкулярная форма варыкознага расшырэння вен. Для славянак гэта больш актуальна, бо сетачка прыкметная на светлай скуры. І плюс жаночая псіхалогія — хочацца, каб усё было ідэальна на малекулярным узроўні. Хоць мужчына можа і не заўважаць гэтага — мы крыху па-іншаму ўспрымаем жанчын.

На этапе, калі бачная сетачка, гэта больш эстэтычная праблема, і кровазварот на ніжніх канечнасцях калі і парушаны, то не крытычна. У гэты час жанчыны набываюць мазі, венатанізавальныя таблеткі, спрабуюць выкарыстоўваць народныя сродкі, крыятэрапію. Але не з'явілася ў свеце ні адной таблеткі ці мазі, каб сасудзістая сетка знікла. Мазі і таблеткі нават не спыняюць, а толькі замаруджваюць развіццё хваробы. Гэта жанчын не задавальняе. Тады ў ход ідуць механічныя метады: або ўводзіцца прэпарат, які склеразіруе вены, або вены прыпякаюцца лазерам. Тактыку тут выбірае доктар.

***— Ці гарантуе гэта вылік на ўсё жыццё?***

— Не. Гэта хранічнае захворванне, і праз нейкі час з'явяцца іншыя вены. Таму можна лічыць, што гэта вайна на ўсё жыццё.

***— Як вызначыцца, ці трэба рабіць аперацыю? Напрыклад, вены выступаюць, але болі няма?***

— Тут трэба вызначыцца, ад чаго адштурхоўвацца. Калі не хочацца мець ні сетачкі на нагах, ні бачных сасудаў, то зразумела, без аперацыі не абысціся. Калі ж глядзець па-іншаму — здаровая нага ці не, — то калі ёсць варыкознае расшырэнне вен, яно ў выніку прывядзе да хранічнай венознай недастатковасці. Пры варыкозе вылучаюць чатыры стадыі. І чым яна вышэй, тым больш сімптомаў. На пачатковай стадыі, калі няма яўнай дэкампенсацыі, то, магчыма, варта пачакаць. Калі бачна яўнае парушэнне кровазвароту на ніжніх канечнасцях, вены павылазілі, то аперацыя робіцца ўжо не дзеля прыгажосці. Тут парушаны сценкі вен, іх можа ўтварыцца тромб, прычым у любым месцы, — і мы атрымаем вялікія праблемы.

***— Для мужчын пытанне прыгажосці не стаіць так востра, таму яны часта не звяртаюць увагі на гэта захворванне. Што можа здарыцца, калі запусціць хваробу?***

— Сапраўды, на першай стадыі мужчын мала цікавіць, што там на нагах, яны могуць і не звяртаць на гэта ўвагу. Праблемы пачынаюцца, калі з'яўляюцца болі ў ікраножнай мышцы, асабліва гэта актуальна для людзей са стаячай работай: прадаўцоў, цырульнікаў, ды і саміх хірургаў, якім даводзіцца стаяць падчас аперацыі па некалькі гадзін. Калі і на гэтай стадыі не лячыць і запусціць хваробу, то потым мы бачым, што пад скурай з'яўляюцца карычневыя плямы. Гэта характэрна для больш пажылога ўзросту. Такая гіперпігментацыя сведчыць аб тым, што эрытрацыты выходзяць за межы сасуда, распадаюцца і ствараюць такую карціну. Мы маем ногі з рэдкім валасяным пакрыццём, нават у мужчын, бо валасяныя фалікулы гінуць з-за недахопу кровазвароту — яны не атрымліваюць кіслароду і пажыўныя рэчывы. Скура становіцца сухая, лушчыцца, і з'яўляецца такая пляма. На наступным этапе наступаюць яўныя дыстрафічныя змены. На месцах карычневых плям і ў іншых утвараюцца трафічныя язвы. Яны доўга і складана лечацца, бо ўзрост дадае праблем, і патрабуюць пастаяннага догляду — перавязачных матэрыялаў, мазяў, таблетак. Пацыенты нават часам не разумеюць, з-за чаго гэта язва ўтварылася, шукаюць мазі, каб рана зажыла. Справа не ў мазі, а ў тым, што тканка ў тым месцы не атрымлівае кіслярод, бо парушаны кровазварот. І трэба аднаўляць яго ў гэтых месцах і прызначаць ранагазажыўляльныя мазі.



***— А на такой стадыі можна рабіць аперацыю?***

— Так. Але чым больш запушчана хвароба, тым большая рызыка пасляаперацыйных ускладненняў. Язва ўтвараецца не за два дні, і нават не за два гады, а за два дзесяцігоддзі ці больш. Да яе трэба не проста доўга ісці, а доўга ўцякаць з палі-клінікі і ад урачоў. Гэта сведчыць пра тое, што чалавек амаль не лячыўся і не займаўся прафілактыкай. Таму калі ёсць праблема, варта вырашыць яе на пачатковым этапе.

> **«Калі жанчына прымае супрацьзачаткавыя сродкі, яна таксама правакуе ўтварэнне варыкознага расшырэння вен. Жаночы арганізм — гармоназалежны. І гэта моцна ўплывае на развіццё захворвання».**

***— Калі падчас аперацыі «закрылі» пашкоджаныя вены і кроў размяркоўваецца па іншых, то рызыка ўтварэння тромбаў знікае?***

— Ёсць найбольш спрыяльныя месцы для ўтварэння тромбу, і тыя, дзе яны вельмі рэдка ўтвараюцца. Як хірург, які непасрэдна робіць падобныя аперацыі, скажу, што тэарэтычна тромб можа ўтварыцца ў любой вене, нават не абавязкова на ніжняй канечнасці. Але калі мы прыбіраем паверхневыя вены на ніжніх канечнасцях, дзе больш высокая імавернасць тромбаўтварэння, мы пазбягаем гэтай рызыкі. Вянозны кровазварот не такі важны, як артэрыяльны, бо там знаходзіцца кроў, якая выканала сваю функцыю. І калі мы прыбіраем паверхневыя вены, то глыбокія спраўляюцца з іх функцыяй. Паверхневыя вены патрэбны, калі яны добра працуюць. У адваротным выпадку яны і самі не працуюць, і іншым не даюць — утвараюць застой крыві на ніжніх канечнасцях. Тады і глыбокія вены працуюць непаўнацэнна. Таму тут трэба ахвяраваць паверхневымі венамі.

***— Аперацыйнае лячэнне не гарантуе, што хвароба не праявіцца зноў, так?***

— Так. Ёсць пацыенткі, якія аперыруюцца і па два-тры разы. Трэба ўсведамляць, што гэта хранічная хвароба, якая прагрэсуе цягам жыцця.

***— Пры вянознай хваробе прызначаюцца прэпараты для ўмацавання вянознай сценкі. Іх важна прымаць?***

— Безумоўна. Нашы сасуды складаюцца з трох слаёў, адзін з іх мышачны. На вуліцы ў нас ад холаду сінее нос. Насамрэч яго колер не змяніўся, гэта звузіліся сасуды і менш паступае крыві. Функцыя мышачнага слоя — пашыраць ці звужаць сасуд. І венатонікі працуюць на тонус сасудаў. Такім чынам мы робім вены больш сабраныя. Нават калі варыкознае расшырэнне ёсць, прыём венатонікаў паляпшае кровазварот на ніжніх канечнасцях.

***— Калі вялікую ролю адыгрывае спадчыннасць, а хвароба была ў маці, бабулі, ці ёсць шанцы ва ўнучкі яе пазбегнуць?***

— Калі ёсць спадчыннасць, шанцы мінімальныя. У такім выпадку першыя прыкметы могуць з'явіцца пасля палавога саспявання. Але любое лячэнне пачынаецца з добрай прафілактыкі. Калі прыходзіце дадому, асабліва пасля доўгага стаяння, трэба проста паляжаць на канапе, крыху прыўзняўшы ногі — хвілін 20, каб разгрузіць вены на ніжніх канечнасцях. Можна выкарыстоўваць мазі для прафілактыкі варыкознага расшырэння вен, наносіць іх варта знізу ўверх. Гэта самае простае. Ёсць розныя хатнія электраміястымулятары — маленькія прысоскі, якія выклікаюць спазм мышц, паляпшаючы адток крыві. Ёсць дамашнія лімфаматы, якія робяць масаж ног. Але калі мы хочам выкарыстоўваць электраміястымулятары, лімфаматы, мы павінны быць упэўнены, што на нагах не паспелі ўтварыцца тромбы, асабліва гэта датычыцца пажылых людзей, бо такія апараты садзейнічаюць іх адрыву. Калі чалавек пажылы, асабліва ляжачы, таксама важна, каб хтосьці рабіў масаж ног, прычым знізу ўверх.

Можна прымаць кантрасны душ: гэта таксама павышае тонус сасудаў, трэніруе іх. Для прафілактыкі карысна рабіць настой з каштанаў, яго прымаюць і ўнутр, і прымяняюць вонкава. Калі чалавек працуе ў офісе і доўга сядзіць за сталом, дастаткова проста паварушыць пальцамі ног, і мышачная помпа пачынае працаваць. Крыху пахадзіць, пастаяць дастаткова, каб мышцы запрацавалі. Варта пазбягаць гіпадынаміі, але і гіпердынамія шкодная, тут важна ведаць меру.

> **«Варыкознае расшырэнне вен (а менавіта на ніжніх канечнасцях вялікая рызыка ўтварэння тромбаў) — праблема для любога хірурга».**

***— Што рабіць у сталым узросце, калі хвароба запушчана і вены «вісяць гронкамі»?***

— Калі хвароба запушчана, з ёй складаней справіцца, але лячыцца ніколі не позна. Таму варта звярнуцца да доктара, вызначыць, на якой стадыі захворванне і што можна зрабіць. І тут трэба памятаць пра рызыку ўтварэння тромбаў. Таму можна рэкамендаваць усё, што звязана з разрэджваннем крыві і паляпшэннем кровазвароту на ніжніх канечнасцях. І пазбягаць усяго, што загушчае кроў. Ёсць прадукты, напрыклад, імбір, якія добра разрэджваюць кроў. Вельмі негатыўную ролю адыгрывае курэнне: для таго каб сапсаваць лёгкія і страўнік, трэба шмат курыць, а каб сапсаваць сасуды, а яны ў нас вельмі ломкія, і невялікай колькасці цыгарэт дастаткова.

# СПРАБУЕМ «ВЫГЛЯДАЦЬ НА МІЛЬЁН» ТАННА

**Эканоміць на сабе — не самае прыемнае рашэнне. Але, на жаль, адно з тых, якія нам час ад часу ўсё ж даводзіцца прымаць. З аднаго боку, сёння ўсё дорага, з другога — дзяўчаты і жанчыны па-ранейшаму хочуць быць прыгожымі і моднымі. Ці магчыма апранацца стыльна і пры гэтым трацiцца на вопратку па мінімуму? У прынцыпе, так. Паспрабуем?**



## САМА САБЕ РЭВІЗОР

Пачнём з рэвізіі гардэроба — ёю на гэты раз заменім шопінг. Часам у «засеках радзімы» можна адшукаць добра забытае старое, якое нечакана будзе вельмі і вельмі дарэчы. Мода цыклічная і развіваецца па спіралі. Калі вы не паправіліся на пару памераў, то класічны трэнч, які вы купілі на другім курсе на ўсю стыпендыю, можа выглядаць надзвычай актуальна праз 20 гадоў. А калі прыбраць або дадаць некаторыя акцэнты, многім старым рэчам можна падарыць другую маладосць.

У першую чаргу звяртаем ўвагу на:

*Белую кашулю ў мужчынскім стылі.* Гэта можа быць і кашуля мужа ці сына. Такія кашулі — прамыя, з адкладным каўняром і без усялякага дэкору — актуальныя ўжо не першы сезон і адкрываюць неверагодны прастор для стварэння вобразаў. Такія ж бязмежныя магчымасці дорыць, дарэчы, і простая прамая белая футболка. Гэтыя рэчы — нібыта чыстае палатно: хочаш — «малюй» сябе ў вобразе строгай бізнес-лэдзі, хочаш — ствары спакуслівы жаночы вобраз.

*Прамыя джынсы цёмнага колеру.* Такія базавыя джынсы, напэўна, ёсць у вашым гардэробе. У ідэале пасадка ў іх павінна быць высокая. Але калі вы куплялі іх гадоў пяць таму, яна наўрад ці будзе такая, як трэба. Ну і добра: схаваем неактуальную лінію таліі пад худзі, талстоўкай або світарам (світар можна апрануць пад пояс).

Глядзім на сабраны за гады «запас» непрадузята. Шукаем базавыя прадметы гардэроба, актуальныя ва ўсе часы. Камбінуем іх з моднымі акцэнтнымі рэчамі — і мы ў трэндзе!



## ВЫХОДЗІМ НА ПАЛЯВАННЕ

Ставіцца да «сэкандаў» з пагардай — па-першае, не сучасна, а па-другое, дорага: цэны на апошнія калекцыі кусаюцца, а ў «сэкандах» можна знайсці брэндавую вопратку за капейкі — часам танней за перакус у кавярні.

Ці можа адзенне, якое не насілі, каштаваць настолькі танна? Адказ — так. І вось чаму. Любімы беларускімі (і ўсімі іншымі) модніцамі брэнд Zara за год пастаўляе ў свае крамы больш за 3 000 000 адзінак адзення. І прыкладна столькі ж — кожны з іншых папулярных брэндаў мас-маркета. А калі дадаць да гэтай гары адзення яшчэ і тую гару, якую выпускаюць кітайскія вытворцы (проста пагартайце Аліэкспрэс!)... Уявім сітуацыю: проста зараз фабрыкі адзення па ўсім свеце зачыняцца. У гэтым выпадку, калі верыць статыстыцы (а чаму б і не паверыць?), новых рэчаў, якія ўжо ёсць у крамах і буціках, людзям нашай планеты хопіць да пяцідзесяці гадоў! А паколькі мода штогод патрабуе ўсё новых калекцый, горы нераскупленага адзення адпраўляюцца... правільна, у «сэканды» і стокі. Так што ношаных і не ношаных рэчаў у «сэканд-хэндах» як мінімум 50х50. Дарэчы, пра рэчы з «сэкандаў», якія ўжо насілі. Па-першае, у крамах «першых рук» рэчы актыўна мераюць, часам дзясяткі разоў на дзень, так што можна меркаваць, яны таксама ношаныя. А па-другое, у «сэкандах» рэчы, якія ўжо насілі, адрозніваюцца якасцю, інакш наўрад ці яны захавалі б таварны выгляд для паўторнага продажу. Ну, а спецыфічны пах адзення з крамаў «другіх рук» — гэта не праблема: ён знікае пасля першага мыцця.

**Такім чынам, правілы купілі рэчаў у «сэканд-хэндах»:**

✓ Перш за ўсё агледзьце зашпількі, кнопкі, маланкі. Яны павінны працаваць. Адмоўцеся ад купляў рэчаў з любімі дэфектамі, нават дробнымі. Магчыма, ліквідаваць іх не атрымаецца.

✓ Як і пры любым шопінгу, не бярыце ўпадабаную рэч, калі не можаце ў думках скласці мінімум тры камплекты з наяўнымі ў вашым гардэробе рэчамі. Бо важна не столькі «што надзець», колькі «з чым надзець». Калі гэтага правіла не прытрымлівацца, ваша шафа будзе заўсёды набітая, а праблема «няма чаго насіць» так і застанецца нявырашаная.

✓ Перад паходам у «сэканд» вызначцеся з тым, што вы шукаеце. Варыянты «Мне патрэбна ўсё!» ці «Не ведаю нават, можа, штосьці-небудзь спадабаецца» для паходаў па «сэкандах» і стоках ну зусім неразумныя.

✓ Будзьце ўважлівыя: паход у «сэканд» — гэта паляванне. Тут можна знайсці ўнікальныя брэндавыя або вінтажныя рэчы, якія стануць асновай вашага новага стылю. Калі яны не ўваходзяць у папярэдне складзены спіс, але вы можаце прыдумаць, з чым іх насіць і адчуваеце, што яны «вашы» — прымярайце і купляйце.

✓ Правільна выбірайце час «палявання». Апынуцца ў «сэкандзе» варта ў дні паступлення тавару. Звычайна нераспраданую вопратку фабрыкі і крамы аддаюць у «сэканды» і стокі ў канцы кожнага сезона. Менавіта тады ёсць магчымасць здзейсніць сапраўды выдатныя пакупкі.

## У РЭШЦЕ РЭШТ

У еўрапейскіх краінах модніцы актыўна папаўняюць гардэроб на распродажах, эканомячы часам каля 80 % першапачатковага кошту адзення. Распродажы звычайна бываюць у канцы сезона, а самыя значныя — зімовыя і летнія. І ў гэты перыяд мерчандайзеры актывізуюцца на сто працэнтаў: усе іх намаганні накіраваны на тое, каб пакупнік, а дакладней, пакупніца, страціла кантроль. На гэта нацэлены лозунгі: «Дзве рэчы па цане адной!» і «Усё ад 25 рублёў!». І, вядома, на гэта працуюць цэннікі з перакрэсленай першапачатковай цаной. На самай справе, на вешалках вы знойдзеце рэчы і «ад 25 рублёў», і значна




даражэйшыя, а замест таго, каб бяздумна верыць перакрэсленым лічбам, варта папярэдне зайсці ў інтэрнэт, выдаткаваць дзесяць хвілін і вывучыць рэальную цэнавую катэгорыю таго тавару, які вы збіраецеся набыць. У любым выпадку, менавіта на распродажах як нідзе варта ўключаць здаровы сэнс. Інакш вы станеце ўладальніцай кучы зусім непатрэбных рэчаў (хай і за паўкошту), выкладзеце на касе круглую суму і, прыйшоўшы дадому, не будзеце ведаць, што з усім гэтым рабіць.

**Такім чынам, законы бяспекі на распродажах:**

* Звычайна распрадаюць «рэшткі» — тое, што не прадаецца за сезон. Відавочна, што найбольш хадавыя памеры S-M-L на распродажы трапляюць значна радзей, чым вялікія ці маленькія. Нягледзячы на гэта, не варта купляць рэч у надзеі, што вы да яе «дахудзееце», як і рэч на некалькі памераў большую, чым вы носіце. Як паказвае практыка, прадметы гардэроба, набытыя з прыцэлам на тое, што вы іх перашыеце, ушыеце, падкароціце і г. д., застаюцца на далёкай паліцы ў шафе «на вечным прыколе», як крэйсер «Аўрора».

✓ Адмоўцеся ад куплі сінтэтычных рэчаў, зробленых з прадуктаў нафтаперапрацоўкі. Усе гэтыя танненькія міленькія нейлонавыя кофтачкі і акрылавыя світаркі непрыемныя ў нашэнні, ад іх бываюць высыпанні і раздражненні, летам у іх горача, зімой холадна. Лепш купляць рэчы з натуральных тканін — прынамсі, вам будзе ў іх камфортна.

✓ Не варта набываць ультрамодныя рэчы ў канцы сезона. Можа быць, наступным летам або наступнай зімой яны акажуцца неактуальнымі і вы не захочаце іх насіць. Распродажы — ідэальнае месца для набыцця базавых рэчаў, над якімі не ўладны час і мода: прамыя цёмныя джынсы без дэкору, штаны класічнай даўжыні і крою, мінімалістычныя сукенкі і прамыя спадніцы, аднатонныя футболкі і кашулі, талстоўкі спакойнай каляровай гамы, пінжакі без лішняга «оверсайзу», класічныя мадэлі вопраткі, абутак лаканічных фасонаў і няяркіх расфарбовак.

✓ У канцы яшчэ адно правіла — тое ж, што і пры шопінгу ў «сэкандзе». На распродажы трапляюць рэчы, «за плячыма» якіх — доўгае «жыццё» ў краме. Іх мералі незлічоную колькасць разоў. Так што правяраем спраўнасць зашпілек, наяўнасць дзірачак і плям ад памады і «таналкі» ўсіх колераў і адценняў. Калі дэфекты ёсць — рэч не вартая нават цаны са зніжкай: цалкам магчыма, што плямы не адмыюцца, а зашпількі паправіць не атрымаецца.

✓ І, нарэшце, перш чым плаціць за кучу выбраных рэчаў, лепш выдыхнуць, выпіць кубачак кавы, можа быць, патэлефанаваць маме і пагутарыць з ёй пра яе здароўе. Карацей, змяніць кірунак думкі. І толькі потым вярнуцца да адкладзеных на касе рэчаў і спытаць сябе, што з іх вам сапраўды неабходна — хутчэй за ўсё, палову адзення вы вернеце на крамныя паліцы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# Адны кралі рыбу, другія глушылі

**Да рыбгаса «Сялец», што ў Бярозаўскім раёне, прысуседзілася цэлая група крымінальных рыбаловаў. Гэтая брыгада з сямі чалавек наладзіла незаконны прамысловы лоў рыбы на возеры Чорнае каля вёскі Спорава. Але зламыснікі трапілі ў поле зроку рэйдавай групы Бярозаўскай міжраённай інспекцыі і супрацоўнікаў міліцыі.**

— Падчас затрымання парушальнікаў было канфіскавана 133 кілаграмы рыбы на суму 428 рублёў, — расказаў карэспандэнту газеты **намеснік начальніка Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Сяргей МЫЧКО.** — Заведзена крымінальная справа.

Яшчэ адна крымінальная справа па факту нанясення ўрону прыродзе ў суме 165 172 рублі распачата ў Івацэвічах. Там на рацэ Мышанцы парушальнікі лавілі рыбу з дапамогай электравуды — забароненага прыстасавання. У выніку больш за 78 кілаграмаў шчупакоў, акунёў, ляшчоў браканьеры паспелі пагрузіць у лодку. Колькі яшчэ пацярпела рыбы ад такога варварскага спосабу здабычы, невядома (названае прыстасаванне знішчае ўсё жывое ў радыусе паражэння).

Двое грамадзян — жыхар Івацэвіцкага раёна і жыхар Баранавіч — затрыманы і будуць прыцягнуты да адказнасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ЗАО «СтеклоБел»** (УНП 191118304) в лице ликвидатора частного предприятия «Эволюция бизнеса».

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **11 ноября 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

**Предмет торгов –**
